Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

25 СТУДЗЕНЯ 2014 г. СУБОТА № 14 (27624) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## ІНТЭЛЕКТУАЛЬНЫ ФУНДАМЕНТ ДЗЯРЖАВЫ

*Віншаванне Прэзідэнта з Днём беларускай навукі і 85-годдзем Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі*

**Дарагія сябры!**

Сардэчна віншую вас з Днём беларускай навукі і 85-годдзем Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

Навука стварае надзейны інтэлектуальны фундамент беларускай дзяржавы, вызначае шляхі нашага руху наперад. Імёны і дасягненні выдатных вучоных з'яўляюцца прадметам гонару ўсяго народа.

Вядучую ролю ў гэтай сферы адыгрывае яе флагман — Нацыянальная акадэмія навук, якая за гады сваёй гісторыі ператварылася ў буйнейшы даследчы цэнтр краіны, што вырашае не толькі фундаментальныя, але і прыкладныя праблемы, карыстаецца аўтарытэтам у свеце.

Сёння беларускай навуцы неабходна выйсці на перадавыя пазіцыі ў стратэгічных напрамках інавацыйнага развіцця, умацаваць сувязь даследаванняў і распрацовак з пільнымі патрэбамі эканомікі і забяспечыць укараненне іх вынікаў у практыку. Упэўнены, што нашы вучоныя паспяхова справяцца з гэтымі важнымі і адказнымі задачамі.

Жадаю вам здароўя, натхнення, поспехаў у навуковай і педагагічнай дзейнасці, шчасця і дабрабыту.

**Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

## АЙЧЫННАЯ НАВУКА: ПЕРАДАВЫЯ ПАЗІЦЫІ — ПА РОЗНЫХ НАПРАМКАХ

**Галоўным крытэрыем эфектыўнасці работы вучоных з'яўляецца ўплыў яе вынікаў на рост айчыннай эканомікі, заявіў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка, уручаючы ўчора дыпломы доктара навук і атэстаты прафесара навуковым і навукова-педагагічным работнікам, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

Фота БЕЛТА.

Аляксандр Лукашэнка ўручае дыплом доктара філалагічных навук Жанне Некрашэвіч-Кароткай.

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу на тое, што мінулы год стаў вельмі важным для айчыннай навукі. «Нямала коп'яў было зламана вакол таго, па якім шляху павінна развівацца навуковая сфера краіны і яе флагман — Акадэмія навук», — сказаў Прэзідэнт. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што пачынаючы пераўтварэнні, у краіне зыходзілі з таго, што перадавая навука не толькі пытанне прэстыжу, але і адзін з гарантаў нацыянальнай бяспекі дзяржавы. «Тут вельмі важна не сячы з-за пляча, а абавязкова зберагчы моцную акадэмію і іншыя навуковыя цэнтры як крыніцы інтэлектуальнай энергіі, адкуль можна чэрпаць наватарскія ідэі для паспяховага развіцця краіны», — лічыць кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што ў краіне пастараліся пазбегнуць радыкальных крайнасцяў і абапіраліся на меркаванні вучоных. Пры іх актыўным удзеле распрацавана комплексная Праграма ўдасканалення навуковай сферы Беларусі, разлічаная на паэтапную мадэрнізацыю. Паводле слоў Прэзідэнта, яе рэалізацыя дасць магчымасць прывесці арганізацыйную структуру навуковай галіны ў адпаведнасць з патрэбнасцямі сучаснай Беларусі, забяспечыць прырытэтнае правядзенне прарыўных даследаванняў, арыентаваных на інавацыйныя вытворчасці і развіццё сучасных інфармацыйных, авіякасмічных, хімічных, біялагічных, машынабудаўнічых і сельскагаспадарчых тэхналогій.

Аляксандр Лукашэнка выказаў упэўненасць, што беларускія даследчыкі прымуць самы актыўны ўдзел у яе рэалізацыі. Паводле слоў Прэзідэнта, Беларусі ўдалося закрыць дарогу ў навуку аўтарам слабых і кампілятыўных работ, пазбегнуць скандалаў з плагіятам, якія ўзрушваюць многія дзяржавы. Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што ў свой час у краіне настаялі на захаванні дзяржаўнай сістэмы прысвоення вучоных ступеняў і званняў. «Дыплом доктара і атэстат прафесара ў Беларусі — гэта сведчанне сапраўды высокай навуковай кваліфікацыі, яны прызнаюцца ва ўсім свеце», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Разам з тым, Прэзідэнт лічыць, што неабходна павысіць эфектыўнасць сістэмы падрыхтоўкі кадраў, пачынаючы з работы магістратуры і аспірантуры. Аляксандр Лукашэнка ўручыў дыпломы доктара аўтарам фундаментальных работ і прарыўных даследаванняў у галіне прыродазнаўчых, прыкладных і гуманітарных навук.

## ЯК ПТУШКА ФЕНІКС

ШЛЯХАМІ ВЫЗВАЛЕННЯ

*Лельчыцкі раён, адзін з двух у Беларусі, цалкам знішчаных фашыстамі, адраджаўся літаральна на папялішчы*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

За свой век былы франтавік Андрэй ГРЫЦКЕВІЧ пабудаваў дзве хаты. Злева — тая, якую ўзвёў адразу пасля вайны. Сёння ветэран жыве ў сваім навейшым доме (справа).

**Канец другога зімняга месяца — асаблівы час для жыхароў Лельчыцкага краю. 23 студзеня яны адзначылі 70-годдзе вызвалення раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Гэтую радасную навіну паведамілі сем дзесяцігоддзяў таму зводка Саюзінфармбюро. У той жа дзень гітлераўцы былі выгнаны з найбліжэйшых вёсак. Астатнія населеныя пункты пазбаўляліся варожых кайданоў яшчэ больш за месяц. Толькі гэтых радасных хвілін ляльчанам прыйшлося чакаць ажно тры з паловай гады. З самых першых дзён, калі да іх прыйшло ўсведамленне страшнай рэальнасці — пачалася вайна...**

СТАР. 4

## ТАРЫФЫ ЖКГ БУДУЦЬ СКРУПУЛЁЗНА ПРААНАЛІЗАВАНЫ

**Жыллёва-камунальную гаспадарку Беларусі чакаюць сур'ёзныя пераўтварэнні. Пра гэта заявіў учора на выніковым пасяджэнні калегіі Міністэрства ЖКГ намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Анатоль КАЛІНІН.**

Зараз ствараецца камісія на чале са **старшынёй Камітэта дзяржкантролю Аляксандрам Якабсонам,** якая прааналізуе працу арганізацый жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Мяркуецца, што яна дэталёва вывучыць праблемныя пытанні ЖКГ для выпрацоўкі і рэалізацыі мер, накіраваных на істотнае паляпшэнне становішча спраў у гэтай сферы. Адным з асноўных кірункаў работы камісіі, як заявіў **міністр ЖКГ Андрэй Шорац**, будзе аналіз тарыфаў і, адпаведна, тых выдаткаў, якія ў іх уключаны.

Анатолем Калініным на пасяджэнні калегіі была пастаўлена задача забяспечыць у 2014 годзе комплексным абслугоўваннем да 50% жыллёвага фонду Беларусі. Пры гэтым у Мінску плануецца перавесці на комплекснае абслугоўванне да 80% жылога фонду. Акрамя таго, намеснік прэм'ер-міністра лічыць неабходным стварыць у сістэме ЖКГ асобную структуру па кіраванні маёмасным комплексам. «Яна будзе працаваць па актах выкананых работ, аказваючы паслугі па прыбіранні вуліц ад снегу, утрыманні тых ці іншых інжынерных сетак, будынкаў, збудаванняў. Праца будзе весціся па планава-разліковых цэнах. Гэта ўвойдзе ў асобны радок выдаткаў на ўтрыманне», — сказаў Анатоль Калінін.

**Святлана БУСЬКО.**

### ДАРЭЧЫ

*За мінулы год у арганізацыі ЖКГ паступіла звыш 94 тысяч зваротаў ад грамадзян і юрыдычных асоб. Зроблена больш за 11 тысяч запісаў у «Кнігі заўваг і прапаноў». У параўнанні з 2012 годам агульная колькасць зваротаў зменшылася на 8%. Аднак колькасць паўторных павялічылася на 25%. Асноўнымі прычынамі па-ранейшаму з'яўляецца нізкая якасць паслуг, невыкананне тэрмінаў правядзення бягучага і капітальнага рамонту, фармалізм і валакіта пры разглядзе зваротаў, а таксама недастатковы кантроль за выкананнем абяцанняў кіраўнікоў.*

### Карысна ведаць

***Пры мінус 15 градусах спецыялісты ЖКГ, адказныя асобы, якія забяспечваюць гатоўнасць ацяпляльных сістэм, трубаправодаў і іншага абсталявання, павінны дзяжурыць кругласутачна.***

## МНС заклікае да павышанай асцярожнасці ў сувязі з моцнымі маразамі

## ЦЫТАТА ДНЯ

**Пётр ПРАКАПОВІЧ, намеснік прэм'ер-міністра:**

***«Малы і сярэдні бізнес развіваецца ў Беларусі дастаткова дынамічна. Намечаныя планы па яго развіцці выконваюцца. Уклад прадпрымальніцкага сектара ў ВРП склаў па выніках 2013 года каля 24%. Прадпрымальнікі стварылі некалькі дзясяткаў тысяч працоўных месцаў. Мы павінны імкнуцца ў бліжэйшыя гады дасягнуць укладу прадпрымальніцкага сектара ў эканоміку краіны на ўзроўні развітых еўрапейскіх дзяржаў — 60-70%. Нам трэба стварыць неабходныя ўмовы, каб гэтыя планы рэальна ажыццявіць. Патэнцыял для гэтага ў Беларусі ёсць, і нядрэнны».***

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 25.01.2014 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 9600,00 | ▲ |
| Еўра | 13140,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 280,00 | ▼ |
| Укр. грыўня | 1138,11 | ▲ |

■ Курсавая розніца

## Еўра расце, расійскі рубель падае

**Негатыўная эканамічная статыстыка з «сусветных лакаматываў» Кітая і ЗША прымусіла на гэтым тыдні адступіць усе валюты краін, якія развіваюцца. «Расіяніна» не падтрымала і цана на нафту.**

Зніжэнне расійскага рубля амаль да ўзроўню 2009 года выклікала занепакоенасць з боку насельніцтва і бізнесу. Аднак аналітыкі сцвярджаюць, што рубель яшчэ адыграе свае пазіцыі. Расійскі Цэнтрабанк наўмысна адмовіўся ад валютных інтэрвенцый для падтрымкі курсу нацыянальнай валюты. Гэтыя дзеянні дазваляюць пазбавіцца ад залішніх выдаткаў золатавалютных рэзерваў, дапамагчы экспарцёрам і падтрымаць даходы бюджэту, што вельмі важна ва ўмовах замаруджвання тэмпаў росту расійскай эканомікі.

У той жа час пра еўра многія эксперты (у тым ліку і еўрапейскія) кажуць наступнае: «...такі вялікі і інтэнсіўны рост курсу можа перайтварыцца ў катастрафічна рэзкае падзенне...». Незадаволенасць насельніцтва высокімі падаткамі ў межах жорсткіх захадаў Цэнтрабанка можа выклікаць неспадзяваныя палітычныя рашэнні — напрыклад, выхад Францыі з еўразоны.

На нашым рынку таксама адлюстраваны сусветныя тэндэнцыі. Долар падаражэў яшчэ на 30 рублёў (плюс 0,3%) да 9600. Еўра «падскочыў» адразу на 120 (плюс 0,9%) да 13140. Расійскі рубель згубіў 6 (мінус 2,1%) да 280.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**

■ Факт і каментарый

## ХІБА ГЭТА ІПАТЭКА?

**Днямі банкаўская супольнасць узрадавала нас з вамі прыемнай навіной: пасля доўгага перапынку ў беларусаў зноў з'явілася магчымасць куплі жылля ў крэдыт. Першым камерцыйным банкам, які аднавіў свае праграмы фінансавання нерухомасці, стаў Белгазпрамбанк.**

Нагадаю, што да апошняга часу падобныя праграмы дзейнічалі толькі ў Беларусбанку і Белаграпрамбанку, дзе задзейнічаны ў тым ліку і дзяржаўныя грошы. Праўда, па іх праграмах можна ўзяць крэдыт толькі на будаўніцтва кватэры. А пазычаць сродкі пад набыццё прыватнай нерухомасці — гэта ўжо цалкам камерцыйная здзелка. Цяпер Белгазпрамбанк прапануе сваім кліентам доўгатэрміновыя крэдыты на ўмовах іпатэкі. Тут маецца на ўвазе тое, што забеспячэннем па крэдыце выступае сам аб'ект нерухомасці — вы прапануеце яго пад заклад выдадзеных грошай. Разам з тым, умовы іпатэчнага крэдытавання ў нашай першай «ластаўкі» не зусім «ласкавыя».

СТАР. 2

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### МУС УКРАІНЫ ЗАКЛІКАЕ НЕ ДАПУСЦІЦЬ НОВЫХ ЧАЛАВЕЧЫХ АХВЯР

МУС Украіны мае інфармацыю пра падрыхтоўку ўзброенай правакацыі, у выніку якой могуць з'явіцца новыя ахвяры, паведамляюць інфармагенцтвы са спасылкай на Упраўленне сувязяў з грамадскасцю ведамства. МУС краіны заклікае радыкальна настроеных грамадзян не звяртацца да экстрэмісцкіх дзеянняў, накіраваных на развязванне грамадзянскай вайны, і спыніць ахвяраваць чалавечымі жыццямі. У той жа час не сціхаюць пратэсты ў рэгіёнах Украіны. Прыхільнікамі апазіцыі захоплены адміністрацыйныя будынкі ў Львове, Цярнопалі, Роўна, Кіеве. У Адэсе пад сценамі мэрыі прыхільнікі ўлады сабраліся на акцыю за больш хуткае мірнае ўрэгуляванне канфлікту ў сталіцы і асобных рэгіёнах. У той жа час адзін з мясцовых тэлеканалаў перадаваў бягучы радок пра тое, што з Кіева прыбылі баевікі апазіцыі, якія маюць намер ажыццявіць сілавы захоп Адэскай аблдзяржадміністрацыі.

### СЯДЗЯЧАЯ ПРАЦА ПРАВАКУЕ РАЗВІЦЦЁ ХВАРОБЫ СЭРЦА

Калі мужчына доўгі час сядзіць, то ў яго павышаецца рызыка сардэчнай недастатковасці, нават нягледзячы на наяўнасць рэгулярных трэніровак у штотыднёвым раскладзе, піша Health India. Каб прааналізаваць выяўленую сувязь, даследчыкі прасачылі за групай з 84170 мужчын 45-69 гадоў без сардэчнай недастатковасці. Прыкладна праз 8 гадоў высветлілася: мужчыны з нізкімі паказчыкамі фізічнай актыўнасці на 52% мелі вышэйшую рызыку сардэчнай недастатковасці, чым мужчыны з высокімі паказчыкамі фізічнай актыўнасці, нават калі была ўлічана колькасць гадзін, праведзеных на крэсле або канапе. Мужчыны, якія сядзелі па 5 гадзін, з недастатковасцю маглі сутыкнуцца на 34% часцей за тых, хто сядзеў у дзень не больш за 2 гадзіны. І трэніроўкі тут не ратавалі. Рызыка падскаквала больш чым у 2 разы ў мужчын, якія сядзелі мінімум 5 гадзін і мала трэніраваліся. Каб скараціць рызыку сардэчнай недастатковасці, варта як мінімум 150 хвілін на тыдзень выдаткоўваць на аэробныя нагрузкі сярэдняй інтэнсіўнасці.

ISSN 1990 - 763X

### ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### ЦРУ ЗАПЛАЦІЛА 15 МЛН ДОЛАРАЎ ЗА СТВАРЭННЕ САКРЭТНАЙ ТУРМЫ Ў ПОЛЬШЧЫ?

У ЗША сталі вядомыя новыя падрабязнасці скандальнай гісторыі з сакрэтнай турмой Цэнтральнага разведвальнага ўпраўлення на паўночным усходзе Польшчы. Як сцвярджае газета The Washington Post, ЦРУ заплаціла 15 мільёнаў долараў наяўнымі за стварэнне гэтай турмы для падазраваных у тэрарызме.

Дзве вялікія кардонныя скрынкі з грашыма ў пачатку 2003 года былі дастаўлены ў Варшаву дыпламатычнай поштай з Германіі. Як паведамлялася раней, ЦРУ пасля тэрактаў 11 верасня 2001 года арандавала вілу, якая належала польскай разведцы, у вёсцы Старэ-Кейкуты. Паводле звестак СМІ, сакрэтная турма, дзе зняволеных катавалі, была закрыта ў верасні 2003 года, а вязняў пад вартай перавялі на аналагічныя аб'екты ЦРУ ў Румыніі і Марока.

У 2007 годзе камісія ЕС прызнала, што сакрэтныя турмы ЦРУ існавалі ў Італіі і Польшчы. Тады спецыяльная камісія выявіла 14 дзяржаў Еўропы, якія дапамагалі амерыканцам праводзіць следчыя мерапрыемствы і стварацъ сакрэтныя турмы, існаванне якіх супярэчыць Жэнеўскай канвенцыі.

### КОРАТКА

У Беларусі 47,1 тыс. малых ва ўзросце да двух гадоў былі забяспечаны бясплатным дзіцячым харчаваннем у 2013 годзе. Фінансаванне на гэтыя мэты склала Br157,9 млрд.

У Беларусі ў 2013 годзе колькасць абанентаў сотавай рухомай электрасувязі павялічылася на 438 тыс. і на 1 студзеня 2014 года склала 11,1 млн. Цяпер сотавай рухомай электрасувяззю ахоплена 98,4 працэнта тэрыторыі рэспублікі, на якой пражывае 99,9 працэнта насельніцтва.

У Мінску стаўкі адзінага падатку з індывідуальных прадпрымальнікаў плануецца павысіць на 14-18 працэнтаў.

На матчы маючага адбыцца чэмпіянату свету па хакеі 2014 года застаецца даступным у продажы шэраг білетаў, рэалізацыю якіх працягвае білетны аператар турніру — ТАА «Тыкетпро». У гэтым спісе няма матчаў з удзелам зборнай Беларусі.

■ Са святам, студыёзусы!

## БЫЛІ РАМАНТЫКАМІ — СТАЛІ ПРАГМАТЫКАМІ?

**Студэнт нічога не забывае — ён проста не засмечвае сваю памяць залішняй інфармацыяй. Студэнт не чэша патыліцу, а абдумвае рашэнне. Студэнт не крычыць — ён адстойвае сваю пазіцыю. Студэнт не памыляецца, а затрымліваецца па важных справах...Сёння, у Таццянін дзень, нават самыя «барадатыя» студэнцкія анекдоты і байкі пойдуць на «ўра» і нават суровыя выкладчыкі ўсміхнуцца чарговай порцыі студэнцкага гумару. Што ні кажы, а моладзі на прасторах былога Саюза сур'ёзна пашанцавала: Дзень студэнта яны адзначаюць двойчы на год — 17 лістапада і 25 студзеня. Экзаменацыйная сесія здадзена — і наперадзе два тыдні зімовых канікулаў. А пакуль студэнты адпачываюць і адзначаюць студэнцкае свята, мы вырашылі пацікавіцца ў кіраўнікоў вышэйшых навучальных устаноў іх меркаваннямі наконт сучаснай моладзі. Сённяшні студэнт — які ён? Ці ёсць розніца паміж студэнтамі XX і XXI стагоддзя? Ці ўжываюць маладыя людзі падчас здачы сесіі розныя хітрыкі? А можа, папяровыя шпаргалкі паспелі ўжо стаць архаізмам?**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

СТАР. 2

# БЕЛАРУСКІХ ПАРЛАМЕНТАРЫЯЎ ЗАПРАСІЛІ НА КУБУ

**Учора ў Доме ўрада адбылася сустрэча Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла гэтай краіны спадара Херарда СУАРЭСА АЛЬВАРЭСА, які нядаўна прыступіў да выканання службовых абавязкаў у нашай краіне, і Старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Уладзіміра АНДРЭЙЧАНКІ.**

Старшыня Палаты прадстаўнікоў адзначыў, што папярэднік спадара Альварэса — Альфрэда Ньевес Партуонда за час сваёй дыпламатычнай місіі зрабіў вельмі шмат для развіцця супрацоўніцтва паміж парламентамі абедзвюх краін. Спікер ніжняй палаты парламента выказаў спадзяванні, што новы пасол прадоўжыць добрыя традыцыі ў працы, накіраваныя на развіццё супрацоўніцтва. «Вы маеце багаты вопыт дыпламатычнай работы, — звярнуўся Уладзімір Андрэйчанка да спадара Альварэса. — Я думаю, што мы зробім усё неабходнае, каб нашы міжпарламенцкія адносіны развіваліся больш інтэнсіўна».

Па словах Уладзіміра Андрэйчанкі, Беларусь зацікаўлена ў развіцці палітычнага дыялогу з Кубай і асабліва ў актывізацыі гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва. «Для гэтага ў нас ёсць усе перадумовы і магчымасці, — акцэнтаваў увагу парламентарый. — Наш прэзідэнт неаднойчы бываў у вашай краіне, сустракаўся са Старшынёй Дзяржаўнага Савета (так называецца пост кіраўніка дзяржавы ў Рэспубліцы Куба. — **Аўт**.). Падпісаны ключавы пагадненні — іх каля 30».

Са свайго боку, пасол Кубы перадаў Уладзіміру Андрэйчанку запрашэнне Старшыні Нацыянальнай асамблеі народнай улады Хуана Эрнандэса наведаць Кубу. «Упэўнены, гэта будзе садзейнічаць далейшаму ўмацаванню развіцця нашых адносін не толькі ў палітычных, эканамічных, але і заканадаўчых аспектах, — падкрэсліў дыпламат. — Мы зацікаўлены ў абмене поглядаў нашых парламентарыяў у практычнай плоскасці».

Новы кіраўнік Пасольства Кубы ў свой час вучыўся ў Маскоўскім дзяржаўным інстытуце міжнародных адносін, ведае рускую і англійскую мовы, а таксама ён знаходзіўся з дыпламатычнай місіяй у Балгарыі і па сумяшчальніцтве — у Македоніі і Албаніі.

Міжпарламенцкае супрацоўніцтва Беларусі і Кубы мае сваю гісторыю, якая пачалася яшчэ ў 1997 годзе. У Нацыянальным сходзе Беларусі традыцыйна фарміруецца рабочая група па супрацоўніцтве з парламентам гэтай краіны.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**

■ З нагоды

# ПРЫЯРЫТЭТЫ НЕ СУПЯРЭЧАЦЬ ШМАТВЕКТАРНАСЦІ

**На нядаўняй прэс-канферэнцыі Прэзідэнта Беларусі з кіраўнікамі беларускіх сродкаў масавай інфармацыі Аляксандр Лукашэнка ў тым ліку адказаў на пытанні, якія тычыліся міжнароднай тэматыкі: адносін Беларусі з Еўрасаюзам і Расіяй. Пракаментаваць прэзідэнцкія тэзісы «Звязда» папрасіла Мікалая САМАСЕЙКУ, старшыню Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах.**

Фота БЕЛТА.

— Я думаю, кіраўнік дзяржавы сказаў вельмі сцісла, але вельмі дакладна пра нашы стасункі як з Расіяй, так і з Еўропай. Мабыць, калі пашырыць яго тэзісы, трэба зыходзіць з таго, што знешняя палітыка Рэспублікі Беларусь з'яўляецца шматвектарнай. Менавіта ў гэтым залог стабільнасці нашай эканомікі, добрасуседскіх адносін.

У любой дзяржавы існуюць некаторыя прыярытэты ў знешняй палітыцы. Я пакрывіў бы душой, калі б сказаў, што ў нас такіх прыярытэтаў няма. У першую чаргу, гэта Расія, пра што яскрава сведчыць такое інтэграцыйнае аб'яднанне, як Саюзная дзяржава. Трэба сказаць, што Саюзная дзяржава, як адно з самых паспяховых інтэграцыйных аб'яднанняў на прасторы СНД, з'яўляецца лакаматывам і для іншых інтэграцыйных аб'яднанняў. У першую чаргу я маю на ўвазе Еўразійскі эканамічны саюз. Дружба з Расіяй не разглядаецца намі ў процівагу адносінам з Захадам. Я спадзяюся, цяпер заходнія палітыкі зразумелі бесперспектыўнасць санкцый у дачыненні да Беларусі, пра што самі ўжо пачынаюць казаць. Зразумелі, што далейшы рух наперад у нашых адносінах можа быць рэалізаваны толькі шляхам дыялогу на раўнапраўнай аснове. Апошнім часам гэтае ўсведамленне прадстаўнікамі Еўрасаюза аб'ектыўных рэалій спрыяе, скажам так, вяртанню да «пацяплення» ў нашых стасунках, да прагматычнасці іх у тым плане, каб далейшыя нашы адносіны былі выгадныя для абодвух бакоў. Дарэчы, цяпер у нас тавараабарот з Еўрасаюзам большы, чым з Расіяй.

Спадзяюся, станоўчая тэндэнцыя ў стасунках з Еўрасаюзам будзе і далей мець пэўную дынаміку. Як пацвярджэнне гэтаму — на вільнюскім саміце Усходняга партнёрства міністр замежных спраў Беларусі прапанаваў вярнуцца да пытання пра паслабленне візавага рэжыму. Такім чынам, мы бачым, што супрацоўніцтва ў адным кірунку абсалютна не прадугледжвае процівагу ў іншым.

Калі казаць пра супрацоўніцтва з краінамі іншых рэгіёнаў, адназначна будзе працягвацца наша ўзаемадзеянне з краінамі Лацінскай Амерыкі. Цяпер да тых дзяржаў, якія ўжо сталі для нас добрымі партнёрамі, я дадаў бы Эквадор, Балівію, Мексіку. Больш за тое, цяпер у нас разглядаецца пытанне аб супрацоўніцтве парламента Беларусі з Лацінаамерыканскім парламентам.

Гаворачы аб шматвектарнасці, трэба згадаць краіны Паўднёва-Усходняй Азіі. Я сказаў бы, дынаміка ў нас рухаецца тэмпамі, якія ўсяляюць аптымізм: гэта адкрыццё зборачных вытворчасцяў у тых жа В'етнаме, Камбоджы. Дарэчы, на днях у гэтай краіне павінна адкрыцца зборачная вытворчасць трактароў. У нас таксама ёсць дынаміка ў гандлёвых адносінах з Інданезіяй, Сінгапурам.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**

# БЫЛІ РАМАНТЫКАМІ — СТАЛІ ПРАГМАТЫКАМІ?

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

**Рэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі, доктар тэхнічных навук, прафесар, акадэмік Міжнародная акадэміі навук вышэйшай школы Міхаіл БАТУРА:**

— Я навучаўся ў Мінскім радыётэхнічным інстытуце (з 1993 года МРТІ быў перайменаваны ў БДУІР) у 70-я гады мінулага стагоддзя. Усё маё жыццё звязана з альма-матар. Я прайшоў усе прыступкі службовай кар'еры, і на маіх вачах змянілася ўжо не адно пакаленне студэнтаў. Таму магу з упэўненасцю сцвярджаць, што цяперашнія студэнты — такія ж прыгожыя, маладыя, актыўныя, задорныя, энергічныя, амбіцыйныя і творчыя, якімі былі і мы. Моладзь — гэта лепшая частка нашага грамадства.

Але, безумоўна, час накладвае свой адбітак. У мае студэнцкія гады было, напэўна, больш рамантыкі, мы былі, у пэўнай ступені, ідэалістамі, нам важна было ўсё рабіць разам. Я дзевяць разоў выязджаў у складзе студэнцкіх будаўнічых атрадаў у Комі АССР і Заходнюю Сібір спачатку ў якасці байца, брыгадзіра, затым — камандзіра атрада, галоўнага інжынера і камандзіра зводнага атрада. І ў мае студэнцкія гады маладых людзей было значна прасцей арганізаваць і сагітаваць на добрую, карысную справу. Дастаткова было аднаго закліку. Сёння ж даводзіцца доўга шукаць патрэбныя словы, каб перамагчы прагматызм і індывідуалізм, уласцівыя маладым людзям. Гэта не недахоп, а, хутчэй, асаблівасць цяперашняй моладзі.

Прагматызм праяўляецца яшчэ пры выбары месца навучання. Мы чым кіраваліся? МРТІ знаходзіўся на вяршыні славы, і нам хацелася абавязкова стаць яго студэнтамі. БДУІР і сёння знаходзіцца на піку папулярнасці ў моладзі (ужо прабачце мяне за нясціпласць), але абітурыенты разважаюць ужо крыху па-іншаму: маўляў, я атрымаю сучасную запатрабаваную спецыяльнасць і мая работа будзе годна аплачвацца. У іх іншыя крытэрыі прывабнасці той ці іншай ВНУ. Галоўнае для іх — што яны будуць мець на выхадзе.

Неабходна канстатаваць, што ў сучасных студэнтаў ёсць такія магчымасці, пра якія мы нават не марылі. Планета для іх — гэта «шарык», які яны могуць аб'ехаць. Студэнты могуць стажыравацца за мяжой і нават праходзіць там вытворчую практыку. Калі я вучыўся, у нас было 44 гадзіны аўдыторных заняткаў у тыдзень, а зараз — усяго 28. Як кажуць, адчуйце розніцу! Студэнтам даецца больш часу для самастойнай работы. Ці правільна яны карыстаюцца прадастаўленымі ім магчымасцямі? Большасць — так, але не ўсе.

Я асабіста не маю нічога супраць шпаргалак, хоць сам імі ніколі не карыстаўся: падрыхтаваць шпаргалку — працаёмкая і карпатлівая работа, якая заслугоўвае павагі. І калі студэнт сам пісаў шпаргалкі, то на экзамене яны яму наўрад ці спатрэбяцца. Усе веды ў яго галаве ўжо раскладзены па палічках. Наяўнасць у студэнта шпаргалкі на экзамене для мяне не з'яўляецца трагедыяй. І я не стану выганяць студэнта з аўдыторыі, а пасаджу яго перад сабой і буду з ім размаўляць. Для мяне важна даведацца, ці ёсць у яго ўвогуле нейкія веды.

**Рэктар Віцебскай дзяржаўнай ветэрынарнай акадэміі, доктар ветэрынарных навук, прафесар, акадэмік Антон ЯТУСЕВІЧ:**

— Мяркую, што папяровыя шпаргалкі цалкам сябе яшчэ не зжылі. Але сучасныя студэнты пайшлі значна далей: на экзаменах яны выкарыстоўваюць ужо больш сучасныя тэхнічныя і радыётэхнічныя сродкі. Хаваюць іх у рукаве, гадзінніках, у... валасах. Былі выпадкі, калі яны выкарыстоўвалі мікранавушнікі нават на дзяржаўных экзаменах. Выпускнік сядзіць у аўдыторыі, а сябар — побач з аўдыторыяй на лаўцы і дыктуе яму правільныя адказы. Даводзілася прыбягаць нават да выкарыстання «глушылак».

Упэўнены, што студэнцкі кантынгент ветэрынарнай акадэміі ўсё ж адрозніваецца ад кантынгенту сталічных ВНУ. У нас шмат сельскай моладзі, таму індывідуалізм уласцівы ім у значна меншай ступені. І аб'яднаць іх нейкай агульнай справай — не праблема.

Шчыра кажучы, я ў нечым зайздрошчу сучасным студэнтам. Акадэмія дае ім магчымасць атрымаць прафесійныя навыкі навучання ў іншых вышэйшых установах свету. Пераважна гэта тычыцца старшых курсаў. За апошнія 15 гадоў мы абнавілі нашу матэрыяльна-тэхнічную базу больш сур'ёзна, чым за ўсе савецкія часы. Пабудавалі новы корпус, пасля чаго нашы вучэбныя плошчы павялічыліся ў два разы. У нас рэканструяваны студэнцкія інтэрнаты. Ёсць свой Дом культуры на 550 месцаў. Студэнты ахвотна дзяжураць ў інтэрнатах, праводзеных на студэнцкае самакіраванне, патрулююць тэрыторыю студгарадка ў складзе дружын. У нас ёсць шмат свят і мерапрыемстваў, якія аб'ядноўваюць усіх студэнтаў: гэта Міжнародны дзень студэнта ў

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

лістападзе, Таццянін дзень, Масленіца; у красавіку — міжнародны фестываль «Зрабі крок наперад», у маі — міжнародны фестываль «Студэнцкая аграрная вясна», абрад «Апошні званок» . Студэнцкае жыццё — вельмі насычанае, цікавае і па-за вучобай...

**Першы прарэктар Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта, кандыдат педагагічных навук, дацэнт Аляксандр АНДАРАЛА:**

— Не маюць рацыю тыя, хто сцвярджае, што дваццаць ці трыццаць гадоў таму студэнты былі лепшыя. Параўнаць цяперашніх студэнтаў і іх папярэднікаў для мяне не праблема: я сам калісьці вучыўся ў педагагічным інстытуце і падрыхтаваў ужо не адно пакаленне педагогаў. Хачу запэўніць, што студэнт застаўся такім жа цікаўным і старанным, як і раней. Ва ўсе часы былі студэнты, якія з горам папалам здавалі сесіі, а былі і такія, што літаральна «не давалі выкладчыкам жыць». Яны ўсё пра ўсё хацелі даведацца, дабрацца да самай сутнасці, мець адказы на ўсе пытанні... А вось самім выкладчыкам стала куды больш складана працаваць. Яны перасталі быць для сваіх студэнтаў адзінай крыніцай ведаў. Ім даводзіцца, так бы мовіць, пастаянна адпавядаць званню педагога, бо студэнты могуць непасрэдна на лекцыі ўключыць свой нэтбук і пераправерыць тое, што толькі што пачулі. Студэнты сталі больш вынаходлівымі на экзаменах. Памятаеце фразу з кінастужкі «Прыгоды Шурыка»: «Дацэнт тупы...»? Тэхнічны прагрэс не стаіць на месцы. Аднак карыстацца шпаргалкай на экзамене я нікому не раю, таму што падман ва ўсе часы застаецца падманам. Я так доўга працую ў педуніверсітэце, што мае студэнты ведаюць: у мяне на экзамене лепш не рызыкаваць.

**Прарэктар па выхаваўчай рабоце Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, кандыдат медыцынскіх навук, дацэнт Уладзімір МАНУЛІК:**

— Амбіцый у сучасных студэнтаў зашмат. Яны больш інфармацыйна «прасунутыя». Больш прагматычныя. Гэта мы кіраваліся радкамі з вядомай песні «Спачатку думай пра Радзіму, а потым — пра сябе». А цяперашніх студэнтаў у першую чаргу цікавіць: «А што нам за гэта будзе?..» Маладыя людзі выраслі ва ўмовах, калі ў іх не было магчымасці выпрабаваць сябе ў ролі лідара, важатага, пабыць валанцёрам. І грамадскае жыццё ўніверсітэта студэнтаў не вельмі цікавіць менавіта з прычыны іх залішняга прагматызму. Таму наша задача — дапамагчы ім у сацыяльнай адаптацыі. А з засваенне вучэбнай праграмы яны і самі паспяхова спраўляюцца.

Матывацыя ў моладзі дастаткова добра выражана. Не бачу нічога дрэннага ў іх імкненні абавязкова атрымаць вышэйшую адукацыю. Нават калі яны і не будуць далей працаваць па атрыманай спецыяльнасці, іх мазгі (ужо прабачце мяне за мой анатамізм) ужо ўсё роўна будуць працаваць па-іншаму. Цікавасць да вышэйшай адукацыі, я лічу, трэба падтрымліваць.

У медыцынскім універсітэце, безумоўна, мала выпадковых людзей. Нашы студэнты, як правіла, рабілі свой выбар свядома. Але на старшых курсах, калі яны ўжо сутыкнуліся з рэаліямі практычнай медыцыны, іх энтузіязм, здараецца, пачынае згасаць. Паняцце доўгу, адказнасці застаецца, а вось рамантыкі вакол прафесіі ўрача становіцца менш.

Я выкладаю ва ўніверсітэце пераважна студэнтам першага—другога курсаў і, шчыра скажу, не нарадуюся: нягледзячы на вельмі напружаны вучэбны працэс і каласальную нагрузку, яны не пасуюць перад цяжкасцямі. У студэнтаў сёння ёсць магчымасць валодаць самай карыснай і цікавай інфармацыяй. Галоўнае, каб яна заставалася не ў інтэрнэце, а ў іх галовах. Калі я на лекцыі задаю ім пытанне на логіку, студэнты пры дапамозе google або yandex праз колькі хвілін выдаюць мне адказ. Яны вельмі прыгожа афармляюць, падаюць матэрыял у навуковых паведамленнях — у гэтым яны на галаву вышэйшыя за сваіх папярэднікаў.

Што яшчэ хацелася б адзначыць: у нашых вучэбных карпусах знік пах нікаціну, хоць яшчэ гадоў пяць таму ў месцах агульнага карыстання «сякеру можна было вешаць». Імкненне да здаровага ладу жыцця і пазбаўленне ад шкодных звычак не можа нас не радаваць, тым больш што сітуацыя са здароўем у будучых медыкаў, як і ва ўсёй моладзі, вельмі складаная. Гэта я вам як медык кажу.

Як я стаўлюся да анекдотаў пра выкладчыкаў і студэнтаў? Гумар я люблю, асабліва калі ён нікога не абражае. Калі студэнты жартуюць на сцэне, я гэта толькі вітаю. Хоць у медыкаў, на погляд старонніх людзей, гумар крыху спецыфічны, але гэта ўжо асаблівасці нашай прафесіі. Упэўнены, што моладзевыя тусоўкі і студэнцкія «капуснікі» вельмі патрэбны. Бо трэба ж не толькі вучыцца. Весяліцца таксама трэба ўмець...

**Падрыхтавала Надзея НІКАЛАЕВА.**

# ХІБА ГЭТА ІПАТЭКА?

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Нават сам старшыня праўлення банка Віктар Бабарыка прызнаўся інфармагенцтвам, што «асноўны мінус жыллёвых крэдытаў на сённяшнім этапе — тэрміны і нагрузка на клієнта». Цяпер жыллёвае крэдытаванне не з'яўляецца для банка асобным сегментам, на якім спецыялісты Белгазпрамбанка вельмі канцэнтруюцца. «Таму, калі сітуацыя стала нестабільнай, мы з гэтага рынку паволі сышлі. Сёлета сітуацыя больш-менш стабілізавалася, але мы не імкнёмся актыўна прасоўваць гэты прадукт», — сказаў Віктар Бабарыка. Па прапануемых праграмах банк згодны прафінансаваць да 70% кошту жылля. Плацяжы можна расцягнуць на 15 гадоў. Плаціць па рахунках трэба штомесяц роўнымі долямі. Пры гэтым магчыма прадастаўленне адтэрміноўкі пагашэння асноўнага доўгу па крэдыце да 12 месяцаў.

Вось на гэтым усе плюсы іпатэчнага крэдытавання і скончыліся. На самой справе працэнтная стаўка па жыллёвых крэдытах ад Белгазпрамбанка трохі вышэйшая, чым у дзяржбанкаў. З моманту атрымання грошай і да прадастаўлення ў банк дагавора аб іпатэцы кліенту давядзецца плаціць 46,5% гадавых. Пасля рэгістрацыі ўсіх дакументаў аб набыцці жылля і яго закладзе карыстанне грашыма стане танней на адзін працэнтны пункт — 45,5% гадавых.

Дарэчы, самыя танныя камерцыйныя крэдыты на будаўніцтва жылля пад 38,5% гадавых выдае Беларусбанк. Тут можна атрымаць крэдыт на 15 гадоў і прафінансаваць да 75% кошту будучай кватэры. У Белагразпрамбанку можна разлічваць на суму ў 90% ад цаны будаўніцтва. Максімальны тэрмін крэдытавання — 20 гадоў. Існуюць і тут свае мінусы. Гэта калі для разліку максімальнай сумы крэдыту дзяржбанкі бяруць у разлік толькі чысты даход аднаго заяўніка. Раней максімум крэдытнай сумы выводзілі з сукупнага даходу сям'і.

У Белгазпрамбанку прынцып разліку максімальнага памеру крэдыту прыкладна такі ж. Аднак для павелічэння сумы крэдыту дазваляецца прыцягнуць паручыцеляў. У разлік возьмуць чвэрць іх даходу. Гэтую норму аб паручыцелях я асабіста не зусім разумею. Крэдыт даецца пад заклад нерухомасці, але кліент павінен шукаць яшчэ і паручыцеляў?

Акрамя таго, пры прапанове іпатэчнага крэдытавання кліентаў Белгазпрамбанка папярэджваюць, што «банк пакідае за сабой права ўстанаўленя ўмоў крэдытавання, адрозных ад указаных у прадастаўленых праграмай крэдытавання. Умовы залежаць ад узроўню рызыкі канкрэтнай крэдытнай здзелкі і кошту грашовых рэсурсаў на фінансавым рынку». Апошняя рэмарка для звычайнага чалавека ўвогуле нейкі «цёмны лес»...

**Сяргей КУРКАЧ.**

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

## «БЕЛАВІЯ» ПЛАНУЕ ЗНІЖЭННІ ТАРЫФАЎ ДЛЯ ПЭЎНАЙ КАТЭГОРЫІ ПАСАЖЫРАЎ

**Нацыянальная авіякампанія «Белавія» займаецца актыўным пошукам унутраных рэзерваў для таго, каб пашырыць дыяпазон прымянення тарыфаў і даць магчымасць мець дастатковую колькасць месцаў па досыць нізкіх цэнах, — заявіў у пятніцу генеральны дырэктар кампаніі Анатоль ГУСАРАЎ.**

Аднак кіраўнік авіякампаніі прызнаў, што нават самыя нізкія цэны на квіткі «Белавія» ў поўнай меры нельга параўноўваць з лаўкост-тарыфамі. «Але, тым не менш, да гэтага ўзроўню мы набліжаемся, асабліва ў перыяды нізкага попыту», — адзначыў гендырэктар. Акрамя таго, спадар Гусараў заявіў, што авіяперавозчык працягне развіваць гібрыдную мадэль, якая спалучае класічныя прынцыпы працы і лаўкост.

Пазіцыю дзяржаўнай кампаніі ўдакладніў намеснік генеральнага дырэктара па маркетынгу Ігар Чаргінец. Ён паведаміў, што адным з такіх унутраных рэзерваў для зніжэння кошту білетаў стане пачатак працы Duty Free гандлю на борце самалёта падчас пералёту і пашырэнне іншых платных паслуг. А па дадатковых паслугах айчынная авіякампанія збіраецца выходзіць на сучасны ўзровень. Прапрацоўваецца магчымасць прадастаўлення бесправаднога інтэрнэту і мабільнай сувязі падчас палёту. Укараненне гэтых паслуг пачнецца ў наступным годзе на новых самалётах па меры мадэрнізацыі парку авіякампаніі, удакладніў Ігар Чаргінец.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## ПАДАРАЖЭЎ ГАЗ ДЛЯ КАМУНАЛЬНА-БЫТАВОГА СПАЖЫВАННЯ АРГАНІЗАЦЫЯМІ І ІП

**У краіне павялічваюцца гранічныя максімальныя адпускныя цэны на звадкаваны газ для камунальна-батавога спажывання арганізацыямі і індывідуальнымі прадпрымальнікамі. Гэта прадугледжана пастановай Міністэрства эканомікі № 1 ад 17 студзеня.**

Гранічная максімальная адпускная цана без ПДВ на газы вуглевадародныя звадкаваныя паліўныя для камунальна-бытавога спажывання, што рэалізуюцца арганізацыям, якія ўваходзяць у састаў «Белпалівагаза», на ўмовах «франка-адпраўлення» павялічылася да Br1 868 260 за тону, а на ўмовах «франка-склад арганізацыі-вытворцы» — да Br1 862 590 за тону. Адпускныя цэны для арганізацый, што не ўваходзяць у састаў «Белпалівагаза», фарміруюцца з улікам рынкавай кан'юнктуры. Гранічная максімальная адпускная цана без ПДВ на тыя ж газы для камунальна-бытавога спажывання для запраўкі ў балоны, што рэалізуюцца юрыдычным асобам і індывідуальным прадпрымальнікам на ўмовах «франка-склад арганізацыі-вытворцы», павялічыліся да Br1 969 240. Пастанова не датычыцца рознічных цэн на газ для насельніцтва, у тым ліку той, што рэалізуецца ў малалітражных балонах.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокае спачуванне намесніку старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па адукацыі, культуры і навуцы Данілевіч Таісе Іванаўне ў сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — смерцю МАЦІ.**

# АГУЛЬНЫЯ АРЫЕНЦІРЫ

## «Лёгкай прагулкі» па XXI стагоддзю не будзе

**17 студзеня 2014 года прэзідэнт Рэспублікі Казахстан Нурсултан Назарбаеў выступіў з Пасланнем да народа «Казахстанскі шлях — 2050: Адзіная мэта, адзіныя інтарэсы, адзіная будучыня», якая абазначыла стратэгічныя прыярытэты развіцця казахстанскага грамадства і дзяржавы на бліжэйшыя некалькі дзесяцігоддзяў.**

Беларусь, як і Казахстан, з'яўляюцца параўнальна маладымі дзяржавамі, толькі пачынаюць асвойваць мастацтва стратэгічнага планавання. Так, у снежні 2012 года ў Казахстане была прынята стратэгія «Казахстан-2050», мэтай якой з'яўляецца стварэнне грамадства дабрабыту на аснове моцнай дзяржавы, развітой эканомікі, уваходжання Казахстана ў трыццатку самых развітых краін свету. Сёння, калі ў беларускім грамадстве пачалося актыўнае абмеркаванне канцэпцыі «Беларусь-2020», якая ўяўляе сабой доўгатэрміновы план развіцця канкурэнтаздольнай эканомікі краіны і грамадства, стратэгія «Казахстан-2050» можа служыць у якасці прыкладу таго, якім чынам дзяржавы і грамадства на постсавецкай прасторы бачаць і праектуюць сваю будучыню. Гэта тым больш важна, бо многія стратэгічныя арыенціры, замацаваныя ў стратэгіі «Казахстан-2050» актуальныя і для Беларусі. Больш за тое, яны неаднаразова гучалі з вуснаў кіраўніка беларускай дзяржавы Аляксандра Лукашэнкі ў дачыненні да нашага кантэксту.

Ужо сёння Казахстан рыхтуецца да таго, што рух да вызначанай у 2050 годзе мэты будзе ажыццяўляцца ва ўмовах няпростай глабальнай канкурэнцыі. Таму для таго, каб стаць паспяховай краінай і трапіць у Топ-30 дзяржаў свету Казахстан павінен прайсці праз шлях глыбокай мадэрнізацыі, мець высокія паказчыкі інвестыцый, навуковых распрацовак, прадукцыйнасці працы, развіцця бізнесу, стандартаў жыцця насельніцтва.

У адпаведнасці з базавымі індыкатарамі краін Арганізацыі эканамічнага супрацоўніцтва і развіцця гэта прадугледжвае дасягненне ў эканоміцы Казахстана штогадовага росту ВУП не ніжэй за 4 працэнты, забеспячэнне павелічэння аб'ёму інвестыцый з цяперашніх 18 працэнтаў да 30 працэнтаў ад усяго аб'ёму ВУП, укараненне навукаёмістай мадэлі эканомікі, стварэнне новых высокатэхналагічных галін эканомікі, рост фінансавання навукі да ўзроўню не ніжэй 3 працэнтаў ад ВУП, фарміраванне перадавой адукацыйнай інфраструктуры, стварэнне эфектыўнай сістэмы падтрымкі студэнтаў і навучэнцаў з высокай паспяховасцю і г.д. Важным удзельнікам на гэтым шляху пераўтварэнняў бачыцца малы і сярэдні бізнес Казахстана, які да 2050 года будзе вырабляць не менш за 50 працэнтаў аб'ёму ВУП Казахстана замест цяперашніх 20 працэнтаў.

Гэта таксама прадугледжвае, што Казахстан павінен стаць адной з самых бяспечных і камфортных для пражывання людзей краінай свету, заснаванай на прынцыпах міру і стабільнасці, справядлівага правасуддзя і эфектыўнага правапарадку.

## Інавацыйная эканоміка — залог паспяховага развіцця дзяржавы

Для таго, каб Казахстан змог увайсці ў лік 30 самых развітых краін свету, неабходна выканаць шэраг задач, галоўнымі з якіх з'яўляюцца фарсіраванае індустрыяльна-інавацыйнае развіццё, паглыбленне інтэграцыі сваёй эканомікі ў рэгіянальную і глабальную эканамічныя сістэмы, перш за ўсё — за кошт удзелу Казахстана ў фарміраванні Еўразійскага эканамічнага саюза і ўступлення ў Сусветную гандлёвую арганізацыю.

Акрамя ўкаранення новых падыходаў да кіравання ў традыцыйных здабываючым, перапрацоўчым і аграрна-прамысловым сектарах эканомікі Казахстана, гэта таксама прадугледжвае стварэнне галін мабільных і мультымедыйных, нана- і касмічных тэхналогій, робататэхнікі, геннай інжынерыі, пошуку і адкрыцця энергіі будучыні. Для вырашэння гэтай задачы неабходна павышэнне патэнцыялу казахстанскай навукі, удасканаленне заканадаўства па венчурным фінансаванні, абароне інтэлектуальнай уласнасці, падтрымцы даследаванняў і інавацый, а таксама камерцыялізацыі навуковых распрацовак. У сувязі з гэтым Казахстан плануе актыўна прыцягваць замежныя інвестыцыі, цалкам выкарыстоўваць іх для трансферту ведаў і новых тэхналогій, ствараць сумесна з замежнымі кампаніямі праектныя і інжынірынгавыя цэнтры.

Безумоўна, важная роля ва ўсіх гэтых працэсах належыць удасканаленню дзяржаўных інстытутаў. Сёння ў Казахстане адбываецца актыўнае ўкараненне прынцыпаў мерытакратыі ў кадравую палітыку дзяржаўных прадпрыемстваў, нацыянальных кампаній і бюджэтных арганізацый. У цэлым структура дзяржаўных органаў Казахстана павінна адпавядаць вырашэнню задач дзеля рэалізацыі мэтаў стратэгіі. Акрамя гэтага, існуе неабходнасць абнаўляць інструменты ўзаемадзеяння дзяржавы з няўрадавым сектарам і бізнесам.

Натуральна, што маштабныя дзяржаўныя пераўтварэнні немагчыма правесці без надання новых імпульсаў развіццю ўсеказахстанскай культуры. Менавіта таму ўжо цяпер у Казахстане важнае значэнне надаецца фарміраванню канкурэнтаздольнай культурнай ментальнасці.

## Ёсць чаму павучыцца

Як відаць, сёння ў Беларусі працякаюць дыскусіі, аналагічныя тым, якія атрымалі сваё афармленне ў выглядзе стратэгічных канцэпцый развіцця Казахстана, пачынаючы ад пытанняў эканамічнай мадэрнізацыі, рэформы дзяржаўных інстытутаў і заканчваючы фарміраваннем новай культурнай палітыкі. Усё гэта сведчыць аб тым, што Беларусь ідзе ў правільным накірунку. Аднак, каб гарантаваць поспех выбранага шляху, гэты рух запатрабуе больш сістэмнага падыходу ў пытаннях стратэгічнага планавання развіцця беларускай дзяржавы і грамадства.

**Арсен СІВІЦКІ.**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ

**28 февраля 2014 г. в 10.00**

**в здании Подлабенского сельского исполнительного комитета (аг. Подлабенье, ул. Солнечная, 17) состоится аукцион по продаже в частную собственность гражданам Республики Беларусь земельных участков для строительства и обслуживания жилых домов**

| Номер лота | Кадастровый номер и адрес земельного участка | Площадь земельного участка, га | Целевое назначение земельного участка | Начальная цена предмета аукциона, бел. руб. | Сумма задатка (руб.) | Расходы по подготовке земел.-кадастр. документации (руб.) | Характеристика инженерных коммуникаций и сооружений на участке |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | | 6 | 7 |
| 1 | 422080415101000081, Гродненская область, Гродненский район, Подлабенский с/с, д. Соловьи, У – 6/Е | 0,1500 | Для строительства и обслуживания жилого дома | **10 022 400** | 1 002 240 | 7 413 320 | ограничений в использовании земель нет |
| 2 | 422080410101000237, Гродненская область, Гродненский район, Подлабенский с/с, д. Наумовичи, У – 20/А | 0,1499 | Для строительства и обслуживания жилого дома | **6 845 600** | 684 560 | 4 200 000 | 0,1499 – водоохранная зона водных объектов |
| 3 | 422080410101000238, Гродненская область, Гродненский район, Подлабенский с/с, д. Наумовичи, У – 21/А | 0,1499 | Для строительства и обслуживания жилого дома | **6 845 600** | 684 560 | 4 200 000 | 0,1499 – водоохранная зона водных объектов |
| 4. | 422080410101000239, Гродненская область, Гродненский район, Подлабенский с/с, д. Наумовичи, У – 22/А | 0,1500 | Для строительства и обслуживания жилого дома | **6 850 200** | 685 020 | 4 200 000 | 0,1500 – водоохранная зона водных объектов |
| 5. | 422080410101000240, Гродненская область, Гродненский район, Подлабенский с/с, д.Наумовичи, У – 23/А | 0,1499 | Для строительства и обслуживания жилого дома | **7 530 200** | 753 020 | 4 200 000 | 0,1499 – водоохранная зона водных объектов |
| 6. | 422080410101000241, Гродненская область, Гродненский район, Подлабенский с/с, д. Наумовичи, У – 24/А | 0,1500 | Для строительства и обслуживания жилого дома | **7 535 200** | 753 520 | 4 200 000 | 0,1500 – водоохранная зона водных объектов |
| 7. | 422080410101000242, Гродненская область, Гродненский район, Подлабенский с/с, д. Наумовичи, У – 25/А | 0,1378 | Для строительства и обслуживания жилого дома | **6 293 100** | 629 310 | 4 200 000 | 0,1378 – водоохранная зона водных объектов, 0,0662 – охранная зона линий электропередачи |
| 8. | 422080410101000243, Гродненская область, Гродненский район, Подлабенский с/с, д. Наумовичи, У – 26/А | 0,1378 | Для строительства и обслуживания жилого дома | **6 293 100** | 629 310 | 4 200 000 | 0,1378 – водоохранная зона водных объектов, 0,0395 – охранная зона линий электропередачи |

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже земельных участков в частную собственность, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462 и состоится при наличии не менее двух участников. В аукционе могут участвовать граждане Республики Беларусь.

Для участия в аукционе гражданин (лично либо через своего представителя) со дня опубликования настоящего извещения и **до 17.00 25 февраля 2014 г.** представляет в комиссию по организации и проведению аукциона по адресу: **аг. Подлабенье, ул. Солнечная, 17,** документы:

заявление на участие в аукционе с указанием кадастрового номера и адреса земельного участка;

копию платежного поручения о внесении задатка в размере 10% от начальной цены предмета аукциона на расчетный счет ГУ МФ РБ по Гродненской области Подлабенский сельисполком, № 3600514090147 в филиал № 400 АСБ «Беларусбанк» г. Гродно, код 752, назначение платежа 04901, УНН 500563252, с отметкой банка о его исполнении;

гражданин – копию документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;

представитель гражданина – нотариально удостоверенную доверенность.

Лицо, желающее принять участие в аукционе, обязано подписать с организатором торгов Соглашение, определяющее взаимные права и обязанности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Порядок осмотра объекта осуществляется участником аукциона по согласованию с организатором торгов.

Контактные телефоны: **(8-0152) 930 670, (8-0152) 930 646, (8-0152) 930 619**.

Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на предоставление предмета аукциона по начальной, увеличенной на 5%, обязан:

в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания его несостоявшимся, внести плату за земельный участок на расчетный счет ГУ МФ РБ по Гродненской области Подлабенский с

■ Персона

# ВУЧЫЦЕСЯ РАДАВАЦЦА

## Інтэрв'ю на вышыні 10 тысяч метраў

**З айцом Фёдарам Поўным, настаяцелем мінскага прыхода храма-помніка ў гонар Усіх Святых, мы дамаўляліся аб інтэрв'ю доўгі час. Настаяцель не адмаўляў, але сустрэча адкладалася столькі разоў, што журналіст, зрэшты, пакінуў свае спробы і спадзяваўся толькі на шчаслівы выпадак. Такі выпадак сапраўды здарыўся. Мы нечакана сустрэліся ў маскоўскім аэрапорце Дамадзедава, у перонным аўтобусе, які дастаўляе пасажыраў да самалёта. А праз некалькі хвілін аказаліся на адным борце паветранага судна. Не скарыстацца такой магчымасцю было нельга. І айцец Фёдар пагадзіўся на такое незвычайнае інтэрв'ю: на вышыні 10 тысяч метраў, па дарозе са сталіцы Расіі ў сталіцу Беларусі, ноччу, пад роўны гул рухавікоў «Боінга-737». Трэба адразу прызнацца, што ў такіх абставінах усе падрыхтаваныя загадзя пытанні здаліся недарэчнымі. Хацелася проста шчыра пагаварыць.**

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

### У тэму:

*З 17 па 24 студзеня 2014 года ў Мінску па бласлаўленні Патрыярха Маскоўскага і ўсяе Русі Кірыла знаходзілася агульнахрысціянская рэлігійная — Дары валхвоў. Святыня размяшчалася ў храме праведнага Іова Шматпакутнага, у прыходзе айца Фёдара Поўнага. Па дадзеных Экзархата, да яе дакранулася больш за 500 тыс. чалавек.*

### Агульныя карані і духоўныя змацаванні

**— Айцец Фёдар, апошні час часта кажуць пра агульныя карані Расіі, Беларусі і Украіны. І пра адзіную веру. Наколькі сапраўды Руская Праваслаўная Царква з'яўляецца моцным змацаваннем для нашых краін?**

— Сёння гэта не такое простае і адназначнае пытанне, і на яго не можа быць, на мой погляд, простага адказу. Вазьміце прыклад Грузіі і Расіі. Таксама праваслаўныя краіны, краіны адной веры, але паглядзіце, як іх развялі. І як тыя, хто належыць да адной веры, лёгка паддаліся гэтаму разводу. Таму ў нашы дні ставіць у аснову асноў веру будзе не зусім правільна.

З іншага боку, калі паглядзець глыбока на гэтыя працэсы, вера з'яўляецца тым змацаваннем, якая нават у разводзе, як у выпадку Грузіі і Расіі, дае людзям магчымасць захоўваць сувязь. Адна справа — паводзіны кіраўнікоў, іншая — адносіны народа. Там кіраўнікі не адчулі народ.

Беларусь і Расія звязаны эканамічна, напэўна, значна больш, чым палітычна. Думаю, чым больш талерантныя і паважлівыя мы будзем у дачыненні адно да аднаго, тым больш моцнае ў нас будзе сяброўства. Беларусь сёння — самастойная дзяржава. Так, у нас адна вера. Я сказаў бы інакш: адна духоўная прастора. Патрыярх Кірыл кажа: «Святая Русь», маючы на ўвазе Расію, Беларусь і Украіну. Калі паглядзець на гістарычныя працэсы і на сучаснасць, мы ўбачым, што нікуды не адышлі ад тых глыбінных рэалій, якія былі ў гістарычным мінулым. Мы іх сёння агалілі. І ў гэтым аголеным выглядзе яны крычаць Небу пра нашы паводзіны. Бо і ў эканоміцы, і ў палітыцы, і ва ўсіх іншых галінах, калі не прысутнічае духоўны складнік, чалавек у сваіх паводзінах апускаецца да ўзроўню жывёльнага інстынкту.

Духоўны складнік вельмі важны, але цяпер, мне думаецца, на ўзроўні эліт не ўсе гатовы да такога паняцця, як духоўнае выпрабаванне. А калі казаць пра ўзровень простага народа, то самым яркім прыкладам у Беларусі сталі мерапрыемствы, прысвечаныя 1025-годдзю Хрышчэння Русі. Гэта быў звычайны працоўны дзень, але 50 тысяч чалавек, па інфармацыі Міністэрства ўнутраных спраў, удзельнічалі ва ўрачыстай літургіі. За 4 дні больш за паўмільёна чалавек прыклаліся да крыжа Андрэя Першазванага. Скажыце: нехта прымушаў людзей? Нехта патрабаваў ад іх? Нейкія разнарадкі паступалі? Людзі стаялі па 12 гадзін! І захоўвалі дысцыпліну, парадак. Гэта сведчыць пра душу народа. Пра тое, што мы не страцілі духоўнага пачатку на генетычным узроўні. Пры ўсіх тых катаклізмах і негатыве, якія назіраюцца ў грамадстве.

### Духоўныя прычыны і чалавечыя праблемы

— Тое, што адбываецца ў грамадстве, таксама мае свае прычыны — ад агульных тэндэнцый і да прыватных выпадкаў. Да мяне ў маёй пастарскай дзейнасці часта звяртаюцца людзі з рознымі праблемамі. Страшнымі праблемамі. Нехта здзейсніў суіцыд, недзе загінула дзіця… І заўсёды нейкая прэтэнзія да Неба. Але калі пачынаеш разбірацца, то абавязкова знаходзіш тлумачэнне. Нават на адлегласці ў некалькі пакаленняў. Нехта ў савецкі час разбураў храм, нехта знішчаў абразы, нехта падчас нямецкай акупацыі быў паліцаем… Мы дарэмна не задумваемся пра тое, што парушэнне духоўных законаў цягне наступствы, якія могуць адбіцца на жыцці нашых дзяцей, унукаў і праўнукаў.

Мы ўпарта рухаемся наперад, не разумеючы, куды вядзе гэты шлях. Але трэба вельмі ўважліва паглядзець і прааналізаваць, што стаіць за намі, якую духоўную спадчыну мы атрымалі. Толькі адштурхоўваючыся ад яе, мы зможам рабіць правільныя крокі. І як бы наша грамадства цяпер ні крытыкавалі за тое, што яно адстае ад сусветных тэндэнцый, дзякуй Богу, што адстае! Спяшаюцца толькі аматары.

Тыя, хто прыязджае жыць у Беларусь (а мне прыходзіцца мець зносіны з самымі рознымі людзьмі), усе адназначна кажуць: тут вельмі камфортна. Яны маюць магчымасць і права так казаць, бо параўноўваюць. А мы прызвычаіліся, не заўважаем. І нам робіцца ў лепшым выпадку… нудна. У горшым мы пачынаем нешта прыдумляць.

Кажу гэта шчыра, бо мне прыходзіцца бываць у розных мясцінах, і я таксама маю права на ацэнку. Ведаеце, прыехаць і паглядзець «вітрыну» нейкай краіны — гэта адно, але ўбачыць яе знутры — зусім іншае. Адна справа — атрымаць камандзіровачныя, памяняць грошы, зрабіць пакупкі, і зусім іншая — апынуцца ў тых абставінах, жыць там і працаваць, атрымліваць высокі, па мерках Беларусі, заробак, а заплаціўшы з яго падатак, не мець магчымасці нават за кватэру разлічыцца…

Думаю, самая вялікая праблема нашага сучаснага свету, і асабліва нашага сучаснага грамадства, у тым, што мы не ўмеем радавацца радасці іншых людзей, іх поспехам. Мы жывём сёння і цяпер, але чамусьці ўвесь час успрымаем жыццё як нейкае жыццё «потым». Дык давайце рабіць усё прыгожа і ў дачыненні да сябе, і ў дачыненні да навакольных.

### Свабода гінуць

**— Ёсць яшчэ адзін аспект, пра які гавораць, калі Беларусь параўноўваюць з іншымі краінамі, — меншая ступень свабоды. Размова ідзе не толькі пра палітычную свабоду, але і свабоду ад маральных табу, у тым ліку рэлігійных…**

— Такая свабода можа прывесці заходні свет да катастрофы. Прычым гэта можа адбыцца яшчэ на нашых вачах. Калі мы кажам пра аднаполыя шлюбы і прыкрываем гэту брыдоту святым словам «свабода», то гэта — падмена паняццяў. У наш час мы можам назіраць пачварную неадпаведнасць высокага ўзроўню тэхнічнага прагрэсу і маральнай дэградацыі. Апошнюю і прыкрываюць тэрмінам «свабода».

Калі рана інфіцыравана і пагражае заражэннем усяму арганізму, вельмі небяспечна яе запудрываць, не зрабіўшы дэзынфекцыі і не ачысціўшы рану ад бруду. Так, пад слоем пудры не будзе відаць раны. Гэта можна назваць свабодай — хачу апрацоўваю рану, не хачу — не апрацоўваю. Але без антысептыкаў, якія выклікаюць боль, рана не толькі не загоіцца, яна можа прывесці да гібелі. Гэта — свабода?

**— Гэта — свабода. Хачу — гіну.**

— Але я такую свабоду не прымаю. Думаю, нам яна не патрэбна.

А навучыцца цярпенню лепш за ўсё ў такім унікальным інстытуце, як сям'я. На жаль, у нашы дні гэты свяшчэнны інстытут перажывае сур'ёзнае выпрабаванне. Сёння ўсё часцей людзі жывуць у тым, што яны называюць «грамадзянскім шлюбам». Святое паняцце «сям'я» ператварылі ў сужыццё. Тут таксама адбылася падмена паняццяў, бо грамадзянскі шлюб — гэта шлюб, які зарэгістраваны органамі выканаўчай улады дзяржавы. А тое, што мы сёння называем гэтым словам — распуста. Чым мы адрозніваемся ад жывёл, якія сходзяцца на шлюбны перыяд? Ніякіх абавязкаў, толькі задавальненне юру, плоцевых пачуццяў. Захацеў — жыву з кімсьці, захацеў — кінуў гэтага чалавека.

У сям'і людзі навучаюцца цярпенню. Нездарма падчас таінства вянчання ў адзін з самых урачыстых момантаў, калі маладую пару абводзяць вакол аналоя тры разы, хор пяе: «Святыя мучанікі, вы шмат пакутавалі і, увенчаныя, маліцеся да Госпада, каб памілаваны былі душы нашы». Без пакут не бывае вянца. Без цярпення не можа быць сапраўднай радасці. Без подзвігу самаахвяравання не атрымаецца сям'і.

**— Аднак цяпер людзі нават не ставяць такой мэты — навучыцца цярпенню, самаахвяраванню. Сёння многія імкнуцца «пажыць для сябе», адкладаюць нараджэнне дзяцей, каб мець магчымасць паглядзець свет, абзавесціся нейкімі рэчамі…**

— Жыццё «потым». Наша бяда ў тым, што мы жывём не сапраўдным жыццём, а нейкай уяўнай будучыняй. Але мы не ведаем, што ў гэтай будучыні будзе, і так праходзяць нашы зямныя дні, у пагоні за міражом, міма сапраўднай радасці, міма сапраўднага жыцця, міма сапраўднай любові…

***На жаль, не ўсё з гэтай размовы ўдалося разабраць на дыктафонным запісе праз гул самалёта і голас бортправаднікоў. На жаль, не пра ўсё, што хацелася, удалося спытаць айца Фёдара. Ды і трэба было даць магчымасць настаяцелю хаця б частку гэтага начнога шляху адпачыць. Выканаць вячэрняе малітвоўныя правіла. На ўсялякі выпадак я спытала протаіерэя Фёдара Поўнага, ці сустракаюць яго ў Мінску. «Вядома,— сказаў ён са стомленай усмешкай.— У гэтым я ўжо даўно не свабодны».***

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

■ З нагоды

# Бабруйскія сустрэчы з Высоцкім

## Магілёўскі трэнер Алег Пракоф'еў пазнаёміўся з Уладзімірам Высоцкім падчас здымак фільма «Я родам з дзяцінства»

**Існуе думка, што вядомы бард ніколі не быў у Бабруйску. Маўляў, калі тут ішлі здымкі сцэн для фільма «Я родам з дзяцінства», дзе Высоцкі сыграў свайго апаленага вайной цёзку, артыст сюды нават і не прыязджаў. Нібыта ў той час ён здымаўся ў карціне Эдманда Кеасаяна «Кухарка» ў Краснадарскім краі і таму з бабруйскай экспедыцыі выпаў. Але ёсць як мінімум два чалавекі, якія аўтарытэтна могуць абвергнуць гэты спрэчны факт.**

Алег Пракоф'еў.

Заслужаны трэнер па веславанні БССР Алег Пракоф'еў расказвае, што яго сустрэча з бардам адбылася дзякуючы рэжысёру фільма Віктару Тураву, з якім Пракоф'еў быў знаёмы з дзяцінства. Калісьці яны разам хадзілі ў марскі клуб пры магілёўскім ДТСААФ. Пасля школы іх сцежкі-дарожкі разышліся. Але тады, у жніўні 1965 года, лёс нечакана звёў іх у Бабруйску.

— Я разам са зборнай камандай вобласці прыехаў у Бабруйск і пасяліўся ў гасцініцы з аднайменнай назвай, — узгадвае Алег Мікалаевіч. — Аднойчы выходжу з нумара, а насустрач па калідоры Віця Тураў, з якім я не бачыўся каля 8 гадоў. Вядома, мы вельмі ўзрадаваліся, сталі распытваць адзін аднаго: дзе ды як. Я сказаў, што з хлопцамі тут на трэніроўках. А Тураў падзяліўся, што здымае фільм. І раптам прапанаваў: слухай, а можаш арганізаваць масоўку на вадзе, кшталту людзі адпачываюць, на лодках катаюцца? Я пагадзіўся. Назаўтра паведаміў сваім падапечным, што будзем удзельнічаць у фільме. Пакуль ішлі здымкі, мы з Туравым размаўлялі пра жыццё. А потым ён запрасіў мяне ў свой нумар.

Апартаменты рэжысёра размяшчаліся на другім паверсе гасцініцы. І вось, калі сябры сядзелі і ўспаміналі за келіхам шампанскага дзяцінства і юнацтва, адчыніліся дзверы і на парозе з'явіўся невысокі сціплы мужчына. Гэта быў тады яшчэ мала каму вядомы Высоцкі. Ён зайшоў паказаць рэжысёру некалькі сваіх песень, якія прапанаваў уключыць у фільм. Віктар Тураў гасцінна запрасіў яго далучыцца да кампаніі і пазнаёміцца з сябрам.

Высоцкі, пачуўшы, што Пракоф'еў трэнер, заўважыў, што іх прафесіі нечым аднолькавыя: увесь час на эмоцыях, у руху… Выпілі шампанскага за знаёмства, але артыст кудысьці спяшаўся і затрымаўся за сталом усяго на некалькі хвілін. Сустрэча была такой кароткай, што Пракоф'еў нават і не ўзгадаў бы пра яе, каб не далейшая шалёная папулярнасць артыста.

Яшчэ адзін сведка візіту Высоцкага ў Бабруйск — Фёдар Скараход, які сёння працуе намеснікам галоўнага ўрача санаторыя «Шыннік». Ён быў адным з тых падлеткаў, якіх трэніраваў у далёкім 1965 годзе Алег Пракоф'еў.

— Высоцкага я бачыў, калі ён разам з іншымі артыстамі адпачываў каля вагончыка на вуліцы Берагавой, дзе ішлі здымкі фільма, — кажа ён. — Нам з таварышамі было цікава за імі назіраць. Нават памятаю, што артыст быў адзеты ў клятчастую шэра-чырвоную кашулю.

Кадр з фільма «Я родам з дзяцінства».

Фёдар Скараход узгадвае, як ён разам з таварышамі па веславанні старанна адпрацоўваў некалькі дубляў на Брэзэне для будучай карціны. Але ў фільм ніводны з іх так і не ўвайшоў. Затое застаўся эпізод, дзе ён сярод іншых удзельнікаў масоўкі складвае дровы. А яшчэ ў фільме можна ўбачыць той паўразбураны мост цераз Брэзіну, які знаходзіўся ў раёне завулка Затонны. Дарэчы, здымкі праходзілі ў раёне пляжа санаторыя імя Леніна. Гэта па-ранейшаму вельмі папулярнае месца адпачынку сярод бабруйчан.

Між тым Бабруйск не пакінуў Высоцкага абыякавым. Невыпадкова ж герой яго «Песні для тых, хто ад'язджае за мяжу» менавіта з гэтага горада. Імя барда тут таксама часта згадваюць падчас прысвечаных яму вечароў, але вось дакументальных сведчанняў таго часу, якія б захоўваліся, напрыклад, у музеі, мне так і не пашчасціла знайсці. Нават здымкаў не засталося.

Няма іх і ў Алега Пракоф'ева, хоць ён вельмі любіў здымаць у тыя часы і меў фотаапарат. Кажа, не да таго было. А шкада. Цяпер, калі прыходзіцца бываць у Бабруйску і сустракацца са сведкамі тых кіназдымак, зноў наплываюць успаміны, у якіх на розныя галасы шуміць лета 1965-га, дзе ўсе яшчэ жывыя і Віктар Тураў, і Уладзімір Высоцкі…

**Нэлі ЗІГУЛЯ**

### Даведка «Звязды»

Нядаўна ў Бабруйску з'явілася скульптура Шуры Балаганава — аднаго з дзяцей лейтэнанта Шміта, які з павагай адазваўся аб гэтым горадзе ў рамане Ільфа і Пятрова «Залатое цяля». А вось Уладзіміру Высоцкаму помніка тут пакуль няма. Як і наогул ва ўсёй Беларусі. Чаго не скажаш пра іншыя краіны. Сёння нават цяжка падлічыць, колькі адкрыта манументаў, памятных дошак, помнікаў у гонар народнага куміра. І гэта толькі найбольш вядомыя з іх.

- **Масква:** помнік на Ваганькаўскіх могілках; ва ўнутраным дворыку Тэатра на Таганцы; скульптурная кампазіцыя Высоцкаму, Акуджаве, Бродскаму ля музея гарадской скульптуры на Пятроўцы.
- **Марыупаль:** стэла каля Дома сувязі; помнік Высоцкаму ў вобразе Жаглова.
- **Самара:** стэла ў скверы імя Высоцкага; скульптурная кампазіцыя ў выкананні Міхаіла Шамякіна, сябра Высоцкага.
- **Барнаул:** бюст Высоцкага.
- **Набярэжныя Чаўны:** помнік на плошчы імя Высоцкага.
- **Падгорыца** (сталіца Чарнагорыі): помнік Высоцкаму.
- **Новасібірск:** помнік каля тэатра «Глобус».
- **Екацярынбург:** помнік Уладзіміру Высоцкаму і Марыне Уладзі.
- **Выршэц** (Балгарыя): стэла Высоцкаму.
- **Калінінград:** помнік у цэнтральным парку.
- **Кіеў:** помнік Жаглову і Шарапаву.
- **Варонеж:** помнік каля інстытута фізкультуры.
- **Паўднёвы Урал:** Памятны знак на вяршыні гары Шабля.
- **Валгадонск Растоўскай вобласці:** скульптурная кампазіцыя «Каханне», прысвечаная Уладзіміру Высоцкаму і Марыне Уладзі.

■ Дзённік настаўніка

# РАЎНЕННЕ НА… ПАСРЭДНАСЦЬ?

Памятаю, упершыню глядзеў фільм «Розыгрыш» (не сучасны яго рымейк, а той, першы) яшчэ ў далёкія студэнцкія гады. Фільм у цэлым спадабаўся… Вось толькі празмерная прынцыповасць настаўніцы ўжо тады падалася мне нейкай, мякка кажучы, неадпаведнай абставінам. Хоць па задумцы фільма, настаўніца тая — персанаж на сто працэнтаў станоўчы, а вось адзін з вучняў (ініцыятар гэтага самага розыгрышу) — персанаж далёка не дадатны. Адмоўны, можна сказаць, персанаж, хоць ён і вучыцца на «выдатна», і спортам актыўна займаецца. Падумаць толькі: навуковую кар'еру марыць зрабіць, ды яшчэ і бацьку роднага папракае за тое, што той у свой час не ў поўным аб'ёме рэалізаваў уласныя магчымасці…

І вось на днях я гэты фільм паглядзеў паўторна. І яшчэ больш пераканаўся ў неадэкватнасці «станоўчай» той настаўніцы.

Паставіць усяму класу «адзінкі» за даволі бяскрыўдны (а да таго ж яшчэ і няўдалы) розыгрыш? У выніку той хлопчык, які ў фільме трактуецца як адмоўны персанаж, з-за прынцыповасці настаўніцы не зможа трапіць на алімпіяду і, хутчэй за ўсё, не зможа паступіць у прэстыжны ўніверсітэт. Краіна, «дзякуючы» прынцыповасці (а дакладней, звычайнай помслівасці) настаўніцы, магчыма, страціць чарговага таленавітага вучонага-матэматыка… Але што з гэтага?

Прынцып, як кажуць, даражэй!

Праўда, фільм ёсць фільм, а жыццё ёсць жыццё. І ў рэальнай жыццёвай сітуацыі кіраўніцтва школы, калі б яму прыйшлося выбіраць паміж першым месцам на алімпіядзе па матэматыцы (гэта ж такі «плюс» для ўстановы!) і хваравітай упартасцю настаўніцы, няхай сабе і тройчы заслужанай, выбрала б усё ж перамогу на алімпіядзе (і гэта лагічна!). Але ці не здараюцца ў жыцці (дакладней, у школьным жыцці) сітуацыі, якія чымсьці нагадваюць тую, з фільма?

Ці не бывае часам так, што настаўнік аддае перавагу «паслухмянай пасрэднасці» перад таленавітым, але далёка не такім паслухмяным вучнем?

З паслухмянымі лёгка, нават калі яны зорак з неба не хапаюць (і ў будучыні наўрад ці схопяць). А вось з таленавітымі…

— Разумны вельмі? — абрывае часам настаўнік вучня, які раптам задаў яму пытанне быццам бы і па тэме, але адказу на яго сам настаўнік, на жаль, не ведае.

І нават не спрабуе высветліць альбо зразумець: задаў вучань гэтае пытанне з адзінай мэтай — спецыяльна «падлавіць» настаўніка і выставіць яго перад класам поўным невукам, ці, можа, ён проста ўпэўнены, што настаўнік павінен ведаць усё па сваім прадмеце?

Найлепшы варыянт у няпростай такой сітуацыі — шчыра прызнацца, што зараз на пытанне ты адказаць не ў стане, але да наступнага ўрока абавязкова знойдзеш на яго адказ. Альбо, калі не хочацца прызнавацца ў тым, што чагосьці не ведаеш, спакойна паведаміць вучню, што сёння ў нас зусім іншыя задачы на ўроку, але ў наступны раз ты адказ на сваё пытанне абавязкова атрымаеш. І, вядома ж, стрымаць сваё слова, нават калі для гэтага некалькі гадзін прыйдзецца прасядзець за камп'ютарам альбо ліхаманкава гартаючы патрэбную літаратуру. На крайні выпадак, калегам тэлефанаваць… Але адказаць абавязкова, нават калі вучань, які задаў пытанне, і не ўспомніць пра гэта на наступным уроку. Бо іншыя вучні таксама чулі пытанне. І іх, магчыма, вельмі цікавіць: ведае настаўнік адказ ці ўсё ж не ведае?

Але ж на гэта столькі свайго асабістага часу трэба затраціць! І, галоўнае, дзеля чаго? Дзеля таго толькі, каб адзін не ў меру разумны вучань цікаўнасць сваю задаволіў?

Сядзь, маўляў, і не рыпайся! Вунь усе астатнія сядзяць, слухаюць… а табе што, больш за іншых трэба?

І вучань гэты сапраўды не задасць больш аніводнага пытання. І, наогул, інтарэс да гэтага прадмета ў яго прыкметна знізіцца. Ды і не толькі ў яго аднаго…

А потым той педагог будзе гучна абурацца ў настаўніцкай:

— Ну што за вучні пайшлі? Нічога ім не цікава, сядзяць на ўроку нібы сонныя! Безуважныя нейкія, да ўсяго абыякавыя…

А чаму вы абураецеся, паважаны педагог? Радуйцеся лепш, што яны такія! Бо вам жа менавіта з такімі, безуважнымі і паслухмянымі, нашмат лягчэй працаваць!

**Генадзь АЎЛАСЕНКА**

■ Будзь у курсе

# У «пашпартны стол» — з улікам новага рэжыму працы

**З 1 лютага змяняецца рэжым работы падраздзяленняў па грамадзянстве і міграцыі тэрытарыяльных органаў унутраных спраў.**

Як патлумачылі ў ГУУС Мінгарвыканкама, гэтыя змены зроблены ў сувязі з праведзеным аналізам колькасці грамадзян, якія звяртаюцца па пытаннях грамадзянства і міграцыі, аб'ёмам адміністрацыйных працэдур, які выконваецца, штатнай колькасцю і нагрузкай на работнікаў згаданых падраздзяленняў. З улікам змен вызначаны наступны графік прыёму грамадзян і рэжым работы падраздзяленняў па грамадзянстве і міграцыі.

Для аддзелаў па грамадзянстве і міграцыі раённых УУС г. Мінска:

аўторак — з 8.00 да 13.00, з 14.00 да 17.00;
серада — з 11.00 да 15.00, з 16.00 да 20.00;
чацвер — з 8.00 да 13.00;
пятніца — з 8.00 да 13.00, з 14.00 да 17.00;
субота — з 8.00 да 13.00, з 14.00 да 17.00.
Выхадныя — нядзеля, панядзелак.

Графік прыёму грамадзян і рэжым работы ўпраўлення па грамадзянстве і міграцыі ГУУС Мінгарвыканкама:

панядзелак — з 8.00 да 13.00;
аўторак — з 14.00 да 17.00;
серада — з 8.00 да 13.00;
чацвер — з 14.00 да 17.00;
пятніца — з 8.00 да 13.00.
Выхадныя — субота, нядзеля.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

■ Ну і ну!

# «Хобі» — выклікаць… міліцыю

**Без усякай прычыны жыхарка Чашніцкага раёна тройчы за кароткі прамежак часу выклікала міліцыю на дапамогу. На жаль, у некаторых суграмадзян ёсць «хобі»: «дзеля смеху» тэлефанаваць у міліцыю, пажарную службу, «хуткую»…**

— Жанчына была аштрафавана на больш як 360 тысяч рублёў. Дарэчы, летась за ўсяго прыкладна 2,5 месяца пракуратурай у суд пададзена 16 іскаў аб спагнанні шкоды ў выніку лжывых паведамленняў у міліцыю, — расказала «Звяздзе» Алена Мацяйковіч, старшая памочніца пракурора Чашніцкага раёна.

Яна нагадала, што за заведама лжывае паведамленне, якое стала повадам для прыняцця мер рэагавання спецыялізаванымі службамі, грамадзяніна могуць аштрафаваць на суму ад 4 да 15 базавых велічынь.

— А за такое ж паведамленне, здзейсненае паўторна на працягу года пасля накладання адміністрацыйнага спагнання, прадугледжаны штраф ад 20 да 50 базавых велічынь, — дадалі ў пракуратуры.

Перш чым набраць нумар «102» або іншыя вядомыя ўсім кароткія нумары, каб паведаміць ілжывую інфармацыю, падумайце, а ці варта…

**Аляксандр ПУКШАНСКІ**

■ Крымінал

# Аперацыя «Метадон»

**У Магілёве затрымалі жанчыну, якая прывезла з Расіі вялікую партыю наркотыкаў.**

Гэта адбылося на пероне чыгуначнай станцыі абласнога цэнтра, калі жанчына цыганскай знешнасці збіралася пакінуць цягнік. Яна знаходзілася на падазрэнні супрацоўнікаў службы па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі на працягу пэўнага часу і, як высветлілася, не беспадстаўна.

Як паведаміла прадстаўніца аддзялення інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Магілёўскага аблвыканкама Юлія Халамеева, беспрацоўная 46-гадовая магіляўчанка мела пры сабе 100 г метадону высокай якасці, які яна прывезла з Расіі. Гэтай колькасці хапіла б на 5000 доз, а калі ўвесці напаўняльнік, як гэта робяць наркагандляры, то і ў некалькі разоў болей. Сёння грам метадону на чорным рынку каштуе 100 долараў. Магчыма сабе ўявіць, які навар атрымалі б падпольныя рэалізатары. Жанчыне давядзецца несці адказнасць па крымінальнай справе. Максімальнае пакаранне, якое прадугледжана ў гэтым выпадку, — 13 гадоў пазбаўлення волі з канфіскацыяй маёмасці. Зараз праводзяцца мерапрыемствы па ўстанаўленні іншых асоб, якія маюць дачыненне да гэтай справы.

Дарэчы, летась супрацоўнікамі ўпраўлення па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі УУС аблвыканкама было выяўлена 400 злачынстваў, звязаных з абарачэннем наркотыкаў, канфіскавана больш за 8 кілаграмаў наркатычных рэчываў, да крымінальнай адказнасці прыцягнута каля 300 чалавек.

**Нэлі ЗІГУЛЯ**

ШЛЯХАМІ ВЫЗВАЛЕННЯ

# ЯК ПТУШКА ФЕНІКС

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

## Пад акупацыяй

Першыя дзевяць бомбаў на Лельчыцы былі скінуты з нямецкіх самалётаў ужо ў панядзелак, 23 чэрвеня 1941 года. На шчасце, яны ўпалі на поле, што каля гарадскога пасёлка... У гэты ж дзень пачалі працаваць мабілізацыйныя пункты. Яшчэ два месяцы раён быў тылавым, затым сюды сунулася лінія фронту. У гэты час уся тэрыторыя тагачаснай Палескай вобласці, у склад якой уваходзілі і Лельчыцы, была пад новай уладай. Лельчыцкі раён стаў апошнім у Беларусі, які акупавалі немцы.

Акрамя таго, на франтах Вялікай Айчыннай і ў партызанскіх атрадах загінулі 2876 ляльчан, 494 вайскоўцы з былых рэспублік Савецкага Саюза ахвяравалі сваім жыццём за вызваленне раёна.

## Вызваленне... з водарам хлеба

А пачалося яно ў ноч на 9 студзеня 1944 года. Першай пазбавілася варожых кайданоў вёска Сініцкае Поле, а 16 студзеня чырвонаармейцы падышлі да ракі Убарць і захапілі плацдарм на заходнім беразе. На

Нашчадкі захоўваюць памяць пра тых, хто некалі загінуў дзеля іх светлай будучыні. На абеліску ў Сіманавічах — імёны палеглых аднавяскоўцаў, вайскоўцаў і партызанаў, якія загінулі тут у снежні 1943 — маі 1944 года. Пахаваны тут і невядомыя салдаты.

Нягледзячы на гэта, тут працягвала існаваць савецкая ўлада, якую падтрымліваў мясцовы партызанскі атрад. Толькі і народныя мсціўцы былі вымушаны пакінуць Лельчыцы ў ноч на 23 верасня 1941 года. На працягу двух з паловай гадоў у раёне «гаспадарылі» гітлераўцы. За гэты час яны паспелі амаль цалкам знішчыць гарадскі пасёлак. Засталіся толькі цагляныя сцены трох будынкаў...

У канцы лістапада 1942 года ў раён уступілі вядомыя злучэнні двойчы Героя Савецкага Саюза генерала Каўпака і Героя Савецкага Саюза генерала Сабурава. А ўжо вясной 1943 года ён стаў цэнтрам партызанскага краю, які ахоплівaў 14 раёнаў Беларусі і Украіны з насельніцтвам звыш 200 тысяч чалавек, дзе базавалася каля 20 тысяч украінскіх, беларускіх, малдаўскіх, палескіх і славацкіх партызанаў, у тым ліку і чэхаславацкі атрад Героя Савецкага Саюза Яна Налепкі.

**У Беларусі два раёны — Асвейскі на Віцебшчыне і Лельчыцкі на Гомельшчыне — былі практычна поўнасцю знішчаны фашыстамі.**

— На лельчыцкай зямлі дзейнічала некалькі пляцовак для атрымання грузаў з Вялікай зямлі, а самы буйны аэрадром каля вёскі Дубніцкае прымаў за адну ноч больш за 10 самалётаў, да 20 самалётаў скідалі вантаж з паветра, — зазначае мясцовы краязнаўца Уладзімір Зубрэй. — Атрымаўшы вантаж, у рэйды сыходзілі шматлікія ўкраінскія злучэнні, малдаўскае злучэнне палкоўніка Андрэева, польскія Роберта Сатаноўскага і Куніцкага. У раёне знаходзіўся і штаб злучэння Паўднёва-Прыпяцкай зоны Палескай вобласці, куды ўваходзілі партызаны Лельчыцкага, Ельскага, Нараўлянскага, Мазырскага і Тураўскага раёнаў.

Няма такіх мясцін у гэтым краі лясоў і балот, дзе б ні пралівалася кроў людзей. Толькі ў снежні 1942 года немцы кінулі супраць злучэнняў Каўпака і Сабурава тры дывізіі. А летам 1943-га буйная блакада чакала партызанаў.

— У Беларусі два раёны — Асвейскі на Віцебшчыне і Лельчыцкі на Гомельшчыне — былі практычна поўнасцю знішчаны фашыстамі, — падкрэслівае Уладзімір Мікалаевіч. — Акупанты пакінулі тут груды развалін з рэшткамі людскіх касцей. Лельчыцы і 62 вёскі раёна былі поўнасцю знішчаны. У першую гадавіну вызвалення раёна, 23 студзеня 1945 года, мясцовая раённая газета пісала: «Банда людаедаў Гітлера люта замучыла і расстраляла 8377 чалавек мірных жыхароў і 3819 чалавек звезла ў нямецкае рабства. Было сагнана ў праклятую Германію 25 270 галоў жывёлы...»

працягу 17-га і 18-га студзеня 54-ты гвардзейскі кавалерыйскі полк уступіў у гарадскі пасёлак Лельчыцы і ў шэраг суседніх вёсак, а 19-га замацаваўся ў 20 кіламетрах у вёсках Сіманічы, Каросцін і Асмаленік. 22-га студзеня з боем была вызвалена вёска Замошша, а на наступны дзень выйшла доўгачаканая зводка Саўінфармбюро аб вызваленні Лельчыц і астатніх населеных пунктаў раёна.

— Пачуўшы радасную вестку, што ў нашы мясціны прыбліжаецца армія-вызваліцельніца, многія юнакі рушылі праз лінію фронту, каб зліцца з франтавікамі. І вось у канцы студзеня адбылася радасная для ўсіх падзея: у вёску ўвайшлі чырвонаармейцы, — успамінае ляльчанін Анатоль Кашэвіч, на той момант шасцігадовы хлапчук. — Мы спачатку нічога не зразумелі, бо гудзенне машын пачулася глыбокай ноччу. Хацелі ўжо па звычцы ўцякаць у лес. Але, пачуўшы рускую мову, не паверылі ў тое — няўжо, няўжо з'явіліся нашы вызваліцелі?

У вызваленні раёна прымалі ўдзел 14-я гвардзейская кавалерыйская дывізія 7-га гвардзейскага кавалерыйскага корпуса, 117-ты стралковы полк 23-й стралковай дывізіі 89-стралковага корпуса 61-й арміі Беларускага фронту. Не абышлося і без дапамогі партызанаў.

Анатоль Кашэвіч і сёння не можа забыць той радасны дзень... вызвалення:

— Рухаліся па вуліцы конныя абозы, гружаныя нейкімі скрынкамі. Мы глядзелі на гэтае відовішча і не маглі ніяк зразумець, што адбываецца на нашых вачах. Калі паўз мяне праехаў воз з вялікай скрыняй, я міжволі пайшоў следам. Сам не ведаю, чаго ўчапіўся рукой за дошку. Спераду воза сядзеў вусаты пажылы чырвонаармеец. Неўзабаве я зразумеў, чаму не мог адарвацца ад той скрыні — ад яе патыхала такім амаль забытым прыемным пахам, што ў мяне закружылася галава. Ішоў па інерцыі, і мяне, здавалася, не магла адарваць ад гэтага вазка ніякая сіла. Каўтаў сліну і хістаўся, губляючы сілу ў нагах. Бачачы тое, вазніца крыху збочыў і спыніўся. Прыадчыніў вечка скрыні і дастаў адтуль бохан хлеба. Сур'ёзна і са шкадаваннем паглядзеў на мяне і прамовіў: «Бери, пацан, угости семью!»

Я не верыў сваім вачам. У руках маіх — сапраўдны бохан хлеба, ад якога ішоў прыемны водар. Ён меў такую сілу і прыцягненне, што я ад радасці заплакаў. Раз-пораз падносіў бохан да свайго твару, удыхаў паветра і не мог надыхацца яго жыццёвай сілай. Вазніца глядзеў на мяне нейкім жаласлівым поглядам, толькі тады ўсміхнуўся, калі пачуў вясёлы смех чырвонаармейцаў, якія крычалі мне, каб я не знюхаў увесь бохан і бег дамоў, бо лапці мае развязаліся і ногі былі зусім мокрымі.

Стрымгалоў кінуўся я да сваёй зямлянкі, дзе мяне чакалі ўжо мае сястрычкі, маці і дзядуля. Маці, як і я раней, паднесла бохан хлеба да твару і пачала ўдыхаць у сябе чароўны пах, ад задавальнення і асалоды прыжмурыла вочы. Затым яна падзяліла бохан на роўныя часткі, астатняе прыхавала надалей. Мне здалося, што яна дала мне трошкі больш, чым усім, — мо за тое, што я здабыў той хлеб і прынёс у хату.

...На працягу больш як месяца чырвонаармейцы вызвалялі Лельчыцкі раён. На гэтым нялёгкім шляху яны не раз сутыкаліся з моцным супраціўленнем ворага: не хацелі немцы пакідаць гэты цудоўны край, які паспелі ўжо аблюбаваць. Даводзілася нават паўторна вызваляць некаторыя населеныя пункты. Так было з вёскамі Замошша, Асмаленік і Сіманіцкі Млынок. Апошнім населеным пунктам раёна, які сустрэў воінаў-вызваліцеляў, стала вёска Глушкавічы. Яна, напэўна, найбольш нацярпелася ад акупантаў за гады вайны...

## Трагедыя Глушкавіч і Тонежа

Гітлераўцамі былі спалены 62 населеныя пункты раёна. З 7314 двароў ацалела толькі 9. Пасля вайны ўсе да адной знішчаныя вёскі былі адноўлены. Сярод спаленых і адноўленых вёсак у Дзяржаўным мемарыяльным комплексе «Хатынь» значацца толькі дзве вёскі Лельчыцкага краю: Глушкавічы і Тонеж.

А вёскі тады былі вялікія, не такія, якія мы сёння прывыклі бачыць! Да вайны ў тых жа Глушкавічах пражывала каля дзвюх тысяч жыхароў. У шматнаселенай вёсцы знаходзіўся калгас «Перамога», дзе развівалася жывёлагадоўля. Было тут і аддзяленне пагранічнікаў, якія ахоўвалі свае заставы на былой савецка-польскай мяжы.

І гэтае добрае жыццё ўраз абарвалася. На працягу трох дзён у канцы снежня 1942 года карнікі здзекаваліся з мірных жыхароў, пасля, ужо паўмёртвых, спалілі разам з усёй вёскай. З 365 хат цудам уцалела толькі адна. Напэўна, засталася незаўважанай, бо стаяла на краі вёскі. Цяпер вядома, што ў Глушкавічах «працаваў» батальён, сфарміраваны ў берлінскіх турмах з крымінальнікаў з вялікім тэрмінам зняволення...

Па афіцыйных звестках, загінула каля 300 чалавек. Толькі сведкі тых крывавых падзей упэўнены: немцы спалілі значна больш глушкаўчан. Пра гэта дакладна ведае мясцовы жыхар Уладзімір Зубрэй. Папрацаваўшы ў розных архівах і прагледзеўшы шмат літаратуры, ён налічыў больш за 400 аднавяскоўцаў, якія загінулі ў той крывавай трагедыі. Яна не абмінула і яго сям'ю. У тым пекле магла апынуцца і яго маці...

— Адным з першых ад рук карнікаў загінуў мой родны дзядзька — Дзямід Карпавіч Кавалевіч, — расказвае Вольга Зубрэй. — Такі ж лёс напаткаў і роднага брата майго будучага мужа, які не даваў паліць новую хату, што нядаўна пабудаваў. Дык яго расстралялі і кінулі ў агонь, якім ужо была ахоплена тая хата... Са сваёй сям'ёй загінуў і яшчэ адзін брат мужа. І мая стрыечная сястра з маленькімі дзецьмі ў тым пекле апынулася. Гора-горачка якое...

**Гітлераўцамі былі спалены 62 населеныя пункты раёна. З 7314 двароў ацалела толькі 9. Пасля вайны ўсе да адной знішчаныя вёскі былі адноўлены.**

Самой Вользе Зубрэй было тады крыху больш за годзік. Нарадзілася яна праз тыдзень, пасля пачатку вайны. У тыя жудасныя дні, калі карнікі здзекваліся з аднавяскоўцаў і палілі вёску, яе маці з малой і са старэйшай сястрычкай хавалася ў лесе. Яны там былі не адны. Толькі гітлераўцы іх знайшлі... Калі ўцякалі, трапілі ў балота. Там маці Вольгі Самсонаўны прамачыла ногі, пасля чаго захварэла і хутка памерла. Дзяцей забралі сваякі. Перад вызваленнем памерла і сястрычка. Неўзабаве Волю забраў бацька, які быў у Лельчыцкім партызанскім атрадзе, а пасля ваяваў на фронце.

Сёння Глушкавічы жывуць звычайным жыццём. Быццам і не было той трагедыі. Толькі пра гэта не забудзеш: у цэнтры вёскі стаіць помнік, які нагадвае аб тым, што тут здарылася.

❐❐❐

Вёска Тонеж была знішчана пазней, у студзені 1943 года. Ворагі спалілі ўсе 375 двароў, забілі каля 300 чалавек. Адгалоскі той трагедыі чутны тут і сёння.

У Настассі Сафонавай тут загінулі маці і малодшая сястрычка. Пайшлі ў вёску, каб узяць цёплую вопратку, ды не вярнуліся. У лесе маці чакалі яшчэ дзве дачкі — дзесяцігадовая Насця і шасцігадовая Галя. Пра тое, што маці з малодшай сястрой больш не вернуцца, дзецям расказала суседка, якой удалося выбрацца з таго агню.

— Ужо калі я падрасла, яна мне расказала, як тое было, — скрозь слёзы ўзгадвае Настасся Паўлаўна. — Калі ўсіх заганялі ў хату, малая сястрычка абвіла матчыну шыю рукамі, плакала і крычала: «Мне баліць!» Іх заганялі ў хату, хто вырываўся — падаў ад кулямётнай чаргі. Толькі таму, што на суседку ўпалі дзеці, яна засталася жывой. Параненая ў нагу, жанчына пасля адпаўзла да цэлай хаты, нашай, і чакала, калі ўсё скончыцца. На наступны дзень мы даведаліся, што ў нас больш няма мамы...

Дзяўчаты засталіся адны. Бацьку раней без віны арыштавалі, брат быў на фронце, адкуль не вярнуўся. Так і хадзілі па вёсках удзвюх, прасілі хлеба. Родная цётка бачыць іх не хацела, чужыя і тое больш дапамагалі.

Амаль усё жыццё Настассі Паўлаўны прайшло ў Тонежы. Тут выхавала дзяцей, адсюль выпусціла іх у жыццё. Муж памёр.

Намеснік старшыні Лельчыцкага райвыканкама Віктар АЛЕЙНІК ля помніка ў вёсцы Прыбылавічы. У снежні 1942 года акупанты спалілі вёску і забілі 52 яе жыхароў. Пасля вайны вёска была адноўлена. Сёння пра мінулую трагедыю нагадвае помнік.

Дзеці раз'ехаліся па ўсёй Беларусі, прыязджаюць рэдка. Так і дажывае свой век у адзіноце.

## Героі Лельчыцкага краю

Каля трох тысяч ляльчан прайшлі суровымі дарогамі вайны ў складзе Чырвонай Арміі. Больш за 2500 з іх аддалі свае жыцці на незалежнасць Радзімы. Дадому вярнуліся толькі 447 франтавікоў і партызанаў.

Адным з тых шчасліўчыкаў быў і Андрэй Грыцкевіч з вёскі Замошша. У сям'і было чацвёра дзяцей. Ён — старэйшы. Калі пачалася вайна, яго ўжо дома не было: прызвалі ў армію на 10 дзён раней. Толькі тады ён яшчэ не ведаў, што ідзе не проста ў войска, што ідзе на вайну. Гэтага не ведаў яшчэ ніхто...

Баявы шлях маладога ляльчаніна пачаўся на Ленінградскім фронце, у пяхоце. Першае баявое хрышчэнне аўтаматчык атрымаў у баі пад Старой Русай. І тут жа быў цяжка паранены — кулявое раненне ў правую нагу. Затым юнака чакала іншая барацьба — за здароўе.

— Мяне даставілі ў шпіталь, што ў Яраслаўлі, хацелі ампутаваць нагу, — успамінае Андрэй Якаўлевіч. — Я не згадзіўся. Уявіў, які з мяне будзе ваяка. А я ж тады малады быў, амбіцыйны, вельмі ж ваяваць хацеў!

Як толькі рана загаілася, Андрэй Грыцкевіч трапіў на 1-ы Беларускі фронт. Разам з аднапалчанамі вызваляў Тулу, Калугу, Бранск, Арол, Жлобін, Гомель. Калі быў у родных краях, папрасіўся дамоў, хоць на дзянёк, — не пусцілі. Вызваляючы Польшчу, фарсіраваў раку Нарву, дзе атрымаў другое раненне — ужо ў левую нагу. Пра ампутацыю ўжо размова не ішла, але падлячыцца прыйшлося. У рэчыцкім шпіталі і дачакаўся Перамогі.

— Вой, як сёння памятаю гэты ўзнёслы голас Левітана, — узгадвае ветэран. — Як мы плакалі тады! А потым песні спявалі, вайну ўспаміналі...

Толькі радавацца доўга не давялося: аб'явіла вайну Японія. Пачалі збірацца ў дарогу. Пакуль прастаялі ў Маскве двое сутак, даведаліся, што Японія капітулявала. Служба

Пачалося новае жыццё. У міры і спакоі. Толькі цяпер былі іншыя турботы: пабудаваць жыллё, уладкавацца на працу, пракарміць сям'ю. І неўзабаве ўсё наладзілася. За 7 кіламетраў пабудаваў хатку, неўзабаве ажаніўся. Дарэчы, гэтая хата стаіць і сёння — цалюткая! Праўда, жыве ветэран вайны ўжо ў больш новай, якую пабудаваў пазней. Кім толькі пасля вайны не працаваў! І лесніком, і аб'ездчыкам, і звычайным рабочым у калгасе, і сакратаром у сельскім Савеце, і начальнікам ваенна-ўліковага стала...

Андрэй Якаўлевіч — шматдзетны бацька: вырасціў трох дачок і двух сыноў. Мае шасцярых унукаў, семярых праўнукаў. Цяпер жыве з дачкой, якая дапамагае па гаспадарцы. Але ветэран вайны таксама не сядзіць на месцы: і вады прынясе, і дроў, і да аўтакрамы схадзіць можа... На пытанне, як так атрымліваецца ў 92 гады, адказвае проста: «Я ж франтавік. А па-іншаму і быць не павінна! Шэсць гадоў вытрымліваў і маразы, і спёку. Бывала, што па некалькі дзён галадаў. Таму ўсё гэта — дробязі».

Такімі людзьмі проста нельга не ганарыцца. Яны — наш галоўны здабытак, наша найкаштоўнейшая спадчына. А для Андрэя Якаўлевіча самае дарагое — ордэн Айчыннай вайны I ступені, ордэн Жукава, медаль «За баявыя заслугі», якія нагадваюць яму пра гады, без якіх нельга сёння ўявіць нашу гісторыю, а яму — свайго жыцця. І яшчэ ў ветэрана вайны ёсць адзін напамін — фотаздымак, зроблены ў жніўні 1944-га. Проста ўнікальны выпадак для таго часу! На фотаздымку — старшы сяржант Грыцкевіч разам з баявым таварышам Іванам Савішным. Андрэй Якаўлевіч часта трымае ў руках гэты фотаздымак: успамінае сябра, з якім рассталіся ў 1945-м і больш ніколі не бачыліся, узгадвае вайну, сваю маладосць, якая прыпала якраз на саракавыя-ракавыя...

❐❐❐

Калі пачалася вайна, Іосіфу Дрынеўскаму з вёскі Новае Палессе (тады яна называлася Каросцін) было 16. У сям'і — пяцёра дзяцей. З трох сыноў ён быў самым старэйшым. І хоць у войска яго яшчэ не бралі, юнак добра разумеў, што на месцы сядзець нельга. Аднак пакуль трэба было дапамагаць па гаспадарцы. А як толькі споўнілася 18, пытацца ні ў кога не стаў: пайшоў у партызанскі атрад імя Варашылава, дзе прабыў з мая 1943-га па чэрвень 1944-га.

Вольга ЗУБРЭЙ цудам не трапіла ў вогнішча, якое ў Глушкавічах учынілі карнікі. Адным з першых быў забіты яе родны дзядзька — Дзямід Кавалевіч.

Розныя даводзілася выконваць заданні. Асабліва помняцца Іосіфу Лявонцьевічу дыверсіі на чыгунцы. Бывае, падкладуць міну — і стаяць варожыя цягнікі: ні на фронт, ні з фронту.

— І няўжо немцы вас не вылічылі, не пакаралі за такія ўчынкі? — пытаюся я.

— Барані Божа! — кажа ветэран, а потым, задумаўшыся, дадае: — Хаця быў адзін такі выпадак. Вярнуліся мы неяк з атрадам у лагер, як раптам — ба-бах! Аказалася, што лагер замініравалі. Дзякуй Богу, што ніхто не папаўся ў тую пастку, усе засталіся жывымі. Праўда, месца дыслакацыі давялося шукаць іншае.

У 1944 годзе партызаны злучыліся з Чырвонай Арміяй. Як казалі ворагі, рускае войска папоўнілася «сталінскімі бандытамі». Іосіф Дрынеўскі трапіў у 222-гі запасны полк 38-й гвардзейскай пяхотнай дывізіі. Дайшоў да Варшавы. Там яго параніла. Тры месяцы прабыў у шпіталі. Пасля — зноў на фронт, ужо ў танкавую брыгаду радыстам-кулямётчыкам. Пасля вызвалення Гдыні і Гданьска рушылі на Берлін. Тут юнак з лельчыцкай зямлі і сустрэў Перамогу.

— Распісаўся на рэйхстагу аўтаматам ППШ, — узгадвае тыя шчаслівыя хвіліны Іосіф Лявонцьевіч.

— І якім гэта чынам? — не магла ўтаймаваць я сваю цікаўнасць.

— Звычайна. Апошнімі кулямі выбіў на сцяне паміж другім і трэцім паверхам сваё прозвішча.

Вайна скончылася, а служба Іосіфа Дрынеўскага працягвалася. Яшчэ 5 гадоў ён выконваў свой доўг перад Радзімай у нямецкім горадзе Баўтцэн. Удзельнічаў у сустрэчы на Эльбе. Дамоў вярнуўся ў 1950 годзе. Таксама не ведаў, хто яго чакае. Чуў некалькі гадоў таму па радыё, што вёску вызвалілі, а больш нічога і не ведаў.

**Каля трох тысяч ляльчан прайшлі суровымі дарогамі вайны ў складзе Чырвонай Арміі. Больш за 2500 з іх аддалі свае жыцці на незалежнасць Радзімы. Дадому вярнуліся толькі 447 франтавікоў і партызанаў.**

На шчасце, усе засталіся жывымі. Толькі хаты, дзе нарадзіўся і вырас, не стала. Але ж гэта было справай часу. Сям'я паступова расла: у 1950 годзе Іосіф Лявонцьевіч ажаніўся. З жонкай жыве і сёння — 64 гады разам! Выхавалі пяцярых дзяцей, дачакаліся васьмярых унукаў і траіх праўнукаў. Пра вайну гаварыць не любяць.

— Яна і сёння мне сніцца, — прызнаецца былы партызан і франтавік. — Бачу, як я змагаюся з ворагам, як абараняюся, бачу сваіх таварышаў па службе, якіх ужо даўно няма ў жывых...

Сёння ветэран вайны — часты госць у школьных класах. Як кажа Іосіф Левонцьевіч, сучасных падлеткаў усё больш цікавіць, за што ў яго той ці іншы медаль. І ветэран расказвае, бо сапраўды за кожнай узнагародай — гісторыя, подзвіг: ордэн Айчыннай вайны II ступені, медалі «За адвагу», «За баявыя заслугі», «За вызваленне Варшавы», «За ўзяцце Берліна»...

Адсюль і загартоўка на ўсё жыццё! Ці як растлумачыць, напрыклад, тое, што былы франтавік маразоў не баіцца? Вось і сёлета з жонкаю зімуюць у сваёй хаце, хоць у горад звалі дзеці. «Пакуль магу прынесці дроў, са свайго гнязда нікуды не паеду! Я тут сам сабе гаспадар», — гаворыць напрыканцы Іосіф Дрынеўскі і запрашае прыязджаць да яго летам, каб паглядзець, як хораша тут, у краі лясоў і балот.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.**
*Лельчыцкі раён.*

Тое, што ў гэтай хаце жыве ветэран вайны, гаворыць зорка, прымацаваная на дзвярах. Каб яна «заззяла», былы франтавік Іосіф ДРЫНЕЎСКІ абяцае пафарбаваць яе перад Днём Перамогі.

Настасся САФОНАВА — апошняя сведка трагедыі ў вёсцы Тонеж.

Наш культурны асяродак
# Жыранделя
Выпуск № 3 (220)



■ Фестывалі

# ПАЛЁТ НАТХНЕННЯ

## ЯК ТВОРЫ МАРКА ШАГАЛА ПАЎПЛЫВАЛІ НА СУСВЕТНЫ БАЛЕТ?

**Аднак жа — паўплывалі! Французскі харэограф пачатку XX стагоддзя Ралан Петыт у Парыжы цесна кантактаваў з Маркам Шагалам. Пад уплывам яго карцін быў створаны нумар «У пошуках страчанага часу». Ён быў уключаны ў беларускую праграму гала-паказу «Зоркі сусветнага балета». Сёлета ўпершыню такая праграма ладзіцца ў рамках музычнага фестывалю «Уладзімір Сівакоў запрашае» (пройдзе ў Беларусі трэці раз).**

Пра ўплывы розных відаў мастацтваў на харэаграфію можна будзе паразважаць падчас балетнага гала. Пра тое, як Маўра Бігандзэці натхняўся творамі Малевіча, так узнік нумар «Колеры Казіміра», дзеля якога адзін з самых вядомых харэографаў сучаснасці правёў 3 месяцы ў падарожжах па розных рэгіёнах Расіі. Самы вядомы на Захадзе расійскі харэограф Барыс Эйман будзе прадстаўлены ў праграме 2 нумарамі: «Ганна Карэніна» і ўрыўкам «Рэквіема» Моцарта. Дарэчы, менавіта ў трупе Эйфмана цяпер працуе выхаванка беларускай харэаграфічнай школы Любоў Андрэева, якая таксама выйдзе на сцэну Палаца Рэспублікі ў гала-паказе зорак сусветнага балета.

**Тобіяс Эхінгер,** які фарміруе гэтую праграму, патлумачыў:

— Другі раз я ствараю гала-паказ для Беларусі, і мой досвед мне падказвае, што тут высокае пачуццё прыгожага і вялікая любоў гледачоў да мастацтва. Балетныя гала ў сусветным маштабе — гэта найперш прэзентацыя дасканаласці. Працуючы над канцэпцыяй балетнага гала я імкнуўся зрабіць акцэнт на тых нумарах і стылях, якія не так часта прадстаўлены ў Еўропе, і на імёнах тых харэографаў, якія рэдка гастралююць і іх не бачылі ў Беларусі. Усе нумары можна пабачыць у выкананні лепшых танцораў вядомых танцавальных труп свету. Я адштурхоўваўся ад гісторыі балета, які быў заснаваны ў Францыі і Італіі, але высока развіваўся ў класічным варыянце дзякуючы Марыусу Пеціпа ў Расіі. Яго развіваў Джордж Баланчын у ЗША, нарадзіўшы абстрактны балет. Затым былі Вільям Фарсайт, Ралан Петыт, сэр Кенет Макмілан і іншыя. Кожная культура прыносіла нешта сваё ў развіццё балетнага мастацтва. У нашай праграме будуць прадстаўлены стылі вядомых харэографаў 2-й паловы XX стагоддзя. Акцэнт робіцца на брытанскай танцавальнай школе, і затым мы пераходзім да стыляў, якія ёсць у Цэнтральнай Еўропе. Напрыклад, мы пакажам, верагодна, самы паспяховы і вядомы нумар у пастаноўцы сэра Макмілана з балета Пракоф'ева «Рамэа і Джульета». Летась ён быў выкананы ў 1500-ы раз! Другі акцэнт робіцца на харэаграфічных стылях і танцавальных школах Германіі. Нямецкую балетную школу прадэманструюць салісты тэатраў Берліна, Мюнхена і Нацыянальнага тэатра балета Штутгарта, вядомага сваімі наватарскімі пошукамі. Артыстычная канцэпцыя праграмы розная для любой краіны, але для Беларусі былі выбраны гэтыя школы, менавіта таму, што іх рэдка можна пабачыць тут.

Максім Берын, прадзюсар фестывалю «Уладзімір Сівакоў запрашае» адзначыў, што сёлета фестываль пройдзе ў рамках юбілейнага года маэстра Сівакова, якому ў верасні спаўняецца 70 гадоў. Маэстра сёлета вырашыў паказаць у Гомелі і Магілёве праграму «Час Чапліна», якая мела вялікі рэзананс мінулы раз. Але ў Мінску будзе прадстаўлена новая праграма «Час Баха», у якой Уладзімір Сівакоў выступіць як скрыпач. Асноўнае, што мелі на мэце арганізатары фестывалю сёлета — не толькі павелічэнне канцэртаў, гарадоў і пляцовак, але тое, як зрабіць яго больш разнастайным, на любы густ. Акрамя новай праграмы «Зоркі сусветнага балета» (пакажуць яе ў Мінску і Віцебску), адметным будзе канцэрт піяніста Аркадзя Валадося (яго карані з Беларусі), разам з Дзяржаўным сімфанічным акадэмічным аркестрам Беларусі. Заключны канцэрт 28 лютага ў Белдзяржфілармоніі прадставіць зорак сусветнай опернай сцэны — салістаў Вялікага і Марыінскага тэатраў у суправаджэнні Дзяржаўнага сімфанічнага акадэмічнага аркестра Беларусі.

**Ларыса ЦІМОШЫК**

■

■ Імпрэза

# Конь як сябар чалавека

## Тое, што ведаюць беларусы, кітайская традыцыя прапаноўвае ўшаноўваць

**Мастачка Марына Эльяшэвіч рыхтуецца да года Каня па кітайскім календары. Не, яна — наша! Але запрашае далучыцца тых, хто збіраецца ў гэтыя дні ў Нацыянальную бібліятэку Беларусі. У галерэі «Панарама» можна сустрэць яшчэ адзін Новы год — у гэтым дапамогуць створаныя мастачкай «Карункі снегу белага».**

Кітай насамрэч не так далёка, як здаецца. Асобныя моманты і дасягненні кітайскай культуры ў Беларусі даўно вядомыя (нават успрымаюцца як свае). І тое, што Новы год кітайскі прыходзіць пазней, толькі прываблівае нас: нагода яшчэ раз перажыць свята.

Марына Эльяшэвіч сапраўды пляце свае мастацкія «карункі» ў кітайскай традыцыі: на рысавай паперы стварае манахромныя і каляровыя малюнкі тушшу. Мала таго, прысвячае іх каню, які ці не самая любімая жывёла кітайскіх мастакоў розных эпох. Але ж каб кітайцы ведалі, наколькі гэта важная жывёла ў беларускай культуры! Сімвал працавітасці, сілы, вынослівасці, вытанчанасці, скіраванасці на рух. Хто ж адмовіцца ад такога года? Разам з мастачкай можна аддаць належнае каню як натхняльніку ў творчасці і прасачыць стаўленне да гэтай істоты ў розныя эпохі. Але каб настроіцца на добры год, то варта ў думках праехаць вярхом (знарок для гэтага падрыхтаваны атрыбуты для верхавой язды) ці ў скуру каня ўлезці (нам прапануюць пайсці праз яго сілуэт). І добры год павінен быць. Па беларускай традыцыі — дакладна…

**Ларыса ЦІМОШЫК**

■

■ Кінакропкі

# «БЕЛАРУСЬФІЛЬМ» НА «ДЗЯРЖАЎНАЙ МЯЖЫ»

## Знялі першыя серыі новага сезона вядомага савецкага серыяла

**— Ты беларускае кіно бачыш?**
**— Не…**
**— А яно ёсць!**

Днямі на кінастудыі «Беларусьфільм» паказалі першы фільм з дзвюх серый «Дзяржаўная мяжа. Кур'еры страху», які мусіць стаць пачаткам новага сезона вядомага ў 1980-ыя гады тэлефільма Барыса Сцяпанава «Дзяржаўная мяжа». Толькі тады дзеянне пачыналася з развалу Расійскай імперыі. А цяпер — з развалу СССР. Некалі напярэдадні «перабудовы» згаданы тэлефільм карыстаўся неверагоднай папулярнасцю. Людзі хацелі экшэну, дзеянняў, эмоцый. Ды і сама тэма развалу нібыта лётала ў паветры. А вось навошта Нацыянальная кінастудыя «Беларусьфільм» узялася за працяг фільма сёння? У гэтым мы і паспрабуем разабрацца.

— У перыяд, калі ў свеце адбываюцца самыя розныя пературбацыі, усё роўна застаюцца нейкія вечныя каштоўнасці і стабільныя паняцці. Такія, напрыклад, як дзяржаўная мяжа,— распавядае **генеральны дырэктар Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм» Алег СІЛЬВАНОВІЧ.**— Таму мы нездарма звярнуліся да тэмы беларускіх памежнікаў.

Яшчэ адной ускоснай прычынай з'яўляецца, так бы мовіць, пачуццё справядлівасці. Лёс склаўся так, што маёмасныя правы на першы сезон «Дзяржаўнай мяжы», зробленай у 1980-ыя гг., належаць расійскаму боку, хоць фільмы і ствараліся на нашай кінастудыі. Але дзяржава тады была адна, а сховішчы Дзяржфільмафонду — у Маскве. Вось фільмакопіі нашых стужак у Маскве і засталіся. Прычым тычыцца гэта не толькі «Дзяржаўнай мяжы». І аддаваць нам ніхто нічога не збіраецца. Таму другі сезон серыяла — гэта свайго роду спосаб устанавіць справядлівасць і ў нейкім сэнсе вярнуць беларускі фільм на радзіму.

Дзеянне пачынаецца ў 1992 годзе на беларуска-літоўскай мяжы, якая толькі з'явілася. Часткова яна праходзіць праз вёску, якую фактычна падзялілі на дзве часткі. Мяжа гэтая пакуль больш нагадвае нейкі міжсабойчык. Ва ўсю працуюць кантрабандысты, мяжу ахоўваюць не спецыяльныя вайскоўцы, а міліцыянты даволі несур'ёзнага выгляду. Калі дамовіцца з кім трэба, то можна і танкі савецкія на той бок для продажу перагнаць. Альбо пахаваць аднавяскоўца ноччу. Рэч у тым, што вясковыя могілкі апынуліся якраз на літоўскім баку, а спецыяльны дазвол на пахаванне выпісваюць надта доўга. У летнюю спёку нябожчык столькі чакаць не можа…

І тут у вёску з Сярэдняй Азіі вяртаецца маёр Антон Пякарскі, якога іграе расійскі акцёр Андрэй Фралоў. Ён, вядома ж, узорны афіцэр-памежнік. І яму прапануюць адразу ўзначаліць заставу. Троху павагаўшыся паміж перспектывай стаць або начальнікам, або кантрабандыстам, Фралоў выбірае першае. А тут, вядома, небяспечныя злачынцы «каўказскай нацыянальнасці» (акцёры Міхаіл Месхі, Рафаэль Рукаеў) крадуць з Чалябінска рэшткі радыеактыўнай вытворчасці і хочуць перагнаць іх у Літву. Але за справу бярэцца «валкадаў» маёр Пякарскі. Яму няма роўных. Вось як сюжэт закруцілі сцэнарысты Валянцін Залужны ды Ілья Цофін.

### ЗНОЎ ВАЮЕМ?

Рэжысёрам-пастаноўшчыкам фільма, дарэчы, з'яўляецца Ігар Чацверыкоў. Мяркуецца, што і наступны фільм «Дзяржаўная мяжа. Легенды асама», які запускаецца ў вытворчасць у лютым, будзе здымаць ён. Яшчэ ў планах зрабіць асобны фільм пра Пінскую рачную флатылію, якая актыўна супрацьстаяла немцам падчас Другой сусветнай вайны. І вось бачыце: зноў словы «немцы», «вайна», «войска», «танкі» суседнічаюць з назвай кінастудыі «Беларусьфільм». Гэтага, відаць, ужо ніколі не пазбегнуць… Яшчэ б! Наша кінастудыя мае самую багатую калекцыю вайсковай тэхнікі, формы ды іншай амуніцыі для кіно! Як ні круці, а пэўная частка фільмаў будзе ўсё роўна звязана з вайной. Толькі адна справа, калі ў 1960-ыя гады пра вайну здымалі «Трэцюю ракету» (рэж. Рычард Віктараў) або «Праз могілкі» (рэж. Віктар Тураў), і зусім іншая, калі гэта звычайныя серыялы. Нават калі яны і больш якасныя, чым многія з тых, што ідуць па расійскім тэлебачанні. І тое проста таму, што ў нас вытворчасць серыялаў яшчэ не стала канвеернай, «заводскай». У нас нават беларускіх акцёраў на серыялы падбіраюць так, быццам для сур'ёзнай поўнаметражнай стужкі з вялікім фестывальным лёсам. Ну, і абавязкова каго-небудзь з расійскіх «зорак» на галоўную ролю, каб павялічыць магчымасці прадаць серыял тэлебачанню суседняй краіны.

Кадры з фільма Ігара Чацверыкова «Дзяржаўная мяжа. Кур'еры страху» (2013).

### З ТЭАТРА НА «ТЭЛЕК»

У «Дзяржаўнай мяжы. Кур'еры страху» цудоўны ансамбль беларускіх акцёраў. Наёмнага злачынцу Барыса пераканаўча грае акцёр Купалаўскага тэатра Павел Харланчук. На працягу дзвюх серый ён забівае кучу людзей і глядзіць такім пранізлівым драпежным позіркам, што аж мурашкі па скуры. Відавочна, акцёры такога калібру нават працу ў серыялах выкарыстоўваць для прафесійнага росту і развіцця. З'яўляецца ў фільме і малады акцёр Тэатра-студыі кінаакцёра Дзмітрый Мухін, які здымаўся, у тым ліку, і ў фільме «Сляды апосталаў». Ён глядзіць вялікімі прыгожымі вачыма і адсочвае аднаго падазронага крымінальнага элемента. Іграюць і Алена Козырава, Ігар Дзянісаў, Мікалай Кучыц, Ганна Кісель, Алег Ткачоў. Пераканаўча справілася і юная школьніца Насця Шапашнікава са сваёй першай роляй цікаўнай дачкі Фралова Рыты, якая з-за адсутнасці іншых кніг перачытала і вывучыла на памяць збор твораў Уладзіміра Ільіча Леніна. Тут людзі гадоў 50 і старэйшыя (на якіх, здаецца, у першую чаргу і разлічаны серыял) павінны ўсміхнуцца. Бо гэта такі сабе настальгічна-трагікамічны штрых з іх дзяцінства таксама. Нечакана напрыканцы фільма ў ролі кантрабандыста з'яўляецца акцёр Тэатра беларускай драматургіі Аляксандр Марчанка. Раней у серыялах ён заўважаны не быў.

На кінастудыі гэта тлумачаць тым, што актыўна шукаюць новыя твары і тыпажы. Супрацоўнікі «Беларусьфільма» знарок ездзяць па абласных беларускіх тэатрах на кастынгі ў пошуках новых акцёраў. І трэба заўважыць, што асобнай школы акцёраў тэлесерыялаў у нас няма, як у Расіі, напрыклад. Не той маштаб краіны. А нашы тэатральныя акцёры даволі ахвотна здымаюцца ў серыялах. Бо іх заробак у тэатрах, як правіла, пакідае жадаць лепшага. Напрыклад, зарплата акцёра ў віцебскім тэатры імя Якуба Коласа прыблізна складае 2,5 млн рублёў.

### ЗВЫШЫДЭЯ

Вядома, у пэўнай ступені за кошт такіх серыялаў кінастудыя можа сабе дазволіць здымаць такія фільмы, як «Рускі» Віктара Аслюка паводле Максіма Гарэцкага, або паўдзельнічаць у супрацоўцы такіх праектаў, як фільм Сяргея Лазніцы «У тумане». Вось патрацілі на вытворчасць дзвюх серый «Дзяржаўнай мяжы» 1 млн доларaў. А пасля продажу на «тэлек» гэтая сума мусіць акупіцца ды яшчэ і прыбытак прынесці. Звычайная матэматыка. Пакуль «Беларусьфільм» існуе ў такіх умовах, што, калі не будзе рабіць серыялы, то эканамічна не выжыве. Але чыста ідэйна серыялы — гэта скок у прорву. Праз год ці два, калі яны пройдуць па ўсіх магчымых тэлеканалах, пра іх ніхто не ўзгадае. Нават калі акцёры добра іграюць і рэжысура неблагая (тут трэба прызнаць, што Ігар Чацверыкоў са сваёй задачай справіўся сумленна). Але трэба і разумець, што серыял — гэта твор жанравы. Ён мае свае законы і сваю стылістыку, канкрэтную мэтавую аўдыторыю са сваімі запатрабаваннямі. Свае клішэ: тут уключым сентыментальную музычку, вось тут дадзім буйны план, каб глыбей паказаць эмоцыі і расчуліць гледача, галоўны герой абавязкова павінен быць «у дошку» свой, а калі ў нейкім эпізодзе п'яніца-недарэка пачне заглядацца на прыгожую цырульніцу, то з-за рага абавязкова з'явіцца яго сварлівая жонка і добранька яму навешае. Усё прадказальна. Ніякага мастацтва, толькі тэхніка, лоўкасць рук.

І вось пасля ўсяго гэтага я асабіста ўсё ж не разумею, чаму наша нацыянальная (нацыянальная!) кінастудыя займаецца тым, чым у іншых краінах займаюцца «прадакшэны» і прыватныя кінакампаніі — вытворчасцю серыялаў. І самае крыўднае, што нават калі беларускі серыял потым ідзе па тэлебачанні або нават прадаецца на пірацкіх DVD-дысках (што ўжо відавочная прыкмета глядацкай любові!), то большасць айчынных гледачоў нават не здагадваецца пра яго паходжанне. А паколькі ў кінатэатрах беларускае кіно паказваюць рэдка, то ў нашага гледача масава ствараецца ўражанне, што беларускага кіно няма. Няпраўда! Яно ёсць. Толькі яго не відаць?..

**Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ**

■

■ Выстава

# ПЕРШАЗАХАПЛЕННЕ

## Летапіс жыцця народнага мастака Беларусі — у карцінах

**Яго можна прачытаць у творах, аб'яднаных выставай, прымеркаванай да 100-годдзя Паўла Васільевіча Масленікава. Выстава праходзіць у Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі і паказвае асобу ў розных іпастасях: таленавіты творца, мастак і настаўнік, вучні якога цяпер працягваюць справу.**

### ПАКЛІКАННЕ

Творы мастака Паўла Масленікава даюць уяўленне пра яго творчы шлях, а з іншага боку — ствараюць магчымасць у літаральным сэнсе прасачыць шлях чалавека, які пралягаў па зямлі, прыводзіў у розныя краі. Захапляючыся прыгожымі краявідамі, ён быў настроены на тое, каб іх шукаць, бачыць на свае вочы і пераносіць на палатно. Узяўшы гэтае захапленне з сабою ад роднае зямлі (нарадзіўся ў вёсачцы Нізкая Вуліца на Магілёўшчыне ў цяжкім і негарманічным 1914 годзе), Павел Масленікаў увесь час быў скіраваны на тое, каб заўважаць і нагадваць пра тое, што ёсць у свеце прыгажосць. Ён насіў гэтае захапленне з сабою, калі трапляў у іншыя краіны, нават экзатычныя: вандраваў з эцюднікам на плячы па Індыі, Непале, Егіпце, назіраў за павольным рытмам прыроднага жыцця Фінляндыі і Швецыі, спасцігаў асаблівасць ландшафту Алтайскага края, Крыма, Прыбалтыкі… Але ў аснове было першазахапленне прыродай роднага краю. Яна дала пачатковую эмоцыю радасці, скіравала зрок і ўнутраны погляд на выяўленне і падтрыманне гармоніі ў свеце. Гэтым светам можна захапляцца сёння — праз яго пейзажы, якія мастак пісаў з асаблівай цеплынёй і любоўю.

Менавіта таму пейзажы Паўла Масленікава склалі аснову вялікай юбілейнай экспазіцыі, на якой прадстаўленая ўсяго толькі каля 50 твораў. Усяго — таму што гэта невялікая часцінка таго, што створана майстрам. Некаторыя з карцін сёння знаходзяцца ў калекцыі Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь, некаторыя прадаставіла сям'я. Але большасць яго прац у нашы дні належаць Магілёўскаму абласному мастацкаму музею, які атрымаў імя свайго славутага земляка ў 1996 годзе, пасля яго смерці. Але яшчэ пры жыцці майстра пры музеі адкрылася персанальная карцінная галерэя Паўла Масленікава. Аўтар сам перадаў каля 140 сваіх прац музею сваёй малой радзімы, якую ён любіў і апяваў у творах.

### ЗМАГАННЕ

Павел Масленікаў быў з тых творцаў, якія ў мастацтва прыходзяць праз прафесійную школу і жыццёвую загартоўку. Адвучыўшыся ў Віцебскай мастацкай вучэльні і толькі пачаўшы працу ў Вялікім оперным тэатры Беларусі, ён стаў абаронцам прыгажосці любімых яму мясцін — на вайне. Найвышэйшая ступень адчування гармоніі часам дасягаецца тады, калі чалавек вымушаны паварочвацца тварам да зла, калі разбуральны пачатак пачынае дыктаваць умовы існавання. Вайна, фронт, акопы… Медаль «За абарону Масквы», «За перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне», ордэн Айчыннай вайны II ступені… Насамрэч лёгка зразумець тых мастакоў, якія прайшлі вайну, а ў мірны час па-свойму адбудоўвалі краіну: праз душы людзей, надаючы ім станоўчыя эмоцыі, прыводзячы да раўнавагі.

Павел Масленікаў не толькі шукаў прыгажосць у свеце, але і быў гатовы бясконца ўдасканальваць сваё творчае майстэрства. Ужо пасля вайны ён вучыўся ў Інстытуце жывапісу, скульптуры і архітэктуры імя Рэпіна ў Ленінградзе, потым скончыў аспірантуру Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Акадэміі навук БССР. Ён быў патрабавальны да сябе як асоба.



Партрэт Паўла Масленикава, напісаны яго сынам Уладзімірам.

### СПРЫЯННЕ

І ён быў патрабавальны да іншых таксама. Асабліва калі сам стаў вучыць творчасці, а быў час, што і ўзначальваў Беларускі дзяржаўны тэатральна-мастацкі інстытут. Фактычна ён заставаўся настаўнікам да апошніх дзён (памёр у 1995-м). Ці можна навучыць творчасці — адно з вечных спрэчных пытанняў. Але адказ на яго ў рамках выставы дадуць вучні Паўла Масленікава: творы 11 вядомых беларускіх мастакоў прадстаўлены ў экспазіцыі. Мэта — паказаць, наколькі настаўнік можа даць штуршок творчаму развіццю і пры гэтым бераўліва захаваць індывідуальную манеру, асабісты погляд кожнага. Сярод тых, хто вучыўся ў Паўла Васільевіча Масленікава — мастакі розных плыняў, напрамкаў, якія прадстаўляюць нават розныя віды мастацтва — ад жывапісу да ручнога ткацтва: Вялянціна Бартлава, Тамара Васюк, Яўген Ждан, Галіна Крываблоцкая, Ала Непачыловіч, Міхась Раманюк, Сяргей Салохін, Наталля Сухаверхава, Яўген Шунейка, Маргарыта Шчамялёва. Усе яны самі ўжо сталі настаўнікамі для іншых пакаленняў творцаў. І можа быць, плён іх настаўніцкай працы залежыць ад колішняга ўплыву асобы майстра Паўла Масленікава. Гэта не скажаш наўпрост, затое адчуеш: ёсць лірызм, які растворaны ў яго працах (а яны нібыта падхапілі), ёсць імкненне спасцігнуць таямніцы прыгажосці, якія наогул для кожнага пакалення могуць адкрывацца з нечаканага боку. І ёсць вобразы таго краю, які кожны носіць у сабе. У асобе Паўла Масленікава яго вучні знайшлі прыклад любові, якая заўсёды дбае пра тое, як павялічыцца і ўзбагаціць свет. А ў Беларусі да таго ж ёсць творчая дынастыя Масленікавых.

**Ларыса ЦІМОШЫК**

■

# Кустурыца і галівудскія каскадзёры папрацуюць на беларускае кіно?

## ДАЙДЖЭСТ НАВІН У АЙЧЫННАЙ КІНАГАЛІНЕ

**Усё змяшалася на «Беларусьфільме». Будынак кінастудыі вось ужо які год знаходзіцца ў стадыі капітальнага рамонту. Зносяць сцены, замуроўваюць выхады, абнаўляюць інтэр'еры, праводзяць цэнтральнае ацяпленне — раней кінастудыя карысталася ўласнай кацельняй. Плануюць нават зрабіць адмысловыя вучэбныя студыі, якімі б маглі карыстацца як навучэнцы Акадэміі мастацтваў, так і іншыя рэжысёры-дэбютанты, якія здымаюць на студыі.**

Але капітальны рамонт патрэбен, здаецца, не толькі будынкам, але і самому працэсу кінавытворчасці ў Беларусі. І пра гэта гавораць кожны год. Прычым апошнім часам амаль кожны год у кінагаліну ўводзіліся нейкія наватарствы.

— Спачатку вырашылі звярнуцца да сістэмы конкурсу, па выніках якога размяркоўваліся дзяржаўныя сродкі на кінавытворчасць,— тлумачыць **генеральны дырэктар Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм» Алег СІЛЬВАНОВІЧ.**— Потым ад конкурсу адмовіліся. Потым уступіў у сілу закон аб дзяржаўных закупах, які зрабіў немагчымым аб'яўленне ніякіх тэндараў…

Словам, галоўная асаблівасць сітуацыі ў беларускім кіно ў тым, што няма ніякай стабільнасці, устойлівага мэтанакіраванага развіцця. Ёсць толькі суцэльная непрадказальнасць. І ў гэтай непрадказальнасці ўсе развіваюцца самі па сабе. Чыста тэхнічна кіно сёння зрабіць прасцей, чым калі-небудзь дагэтуль. Усё часцей чуваць пра незалежныя эксперыменты маладых беларусаў, якія едуць вучыцца кінематографу за мяжу. І не здзіўлюся, калі ў бліжэйшай будучыні менавіта яны будуць ствараць моду ў беларускім кіно. Вось акурат напрыканцы студзеня кінакампанія Nonstop Media нарэшце пачне здымаць меганацыянальны праект «Авель». У галоўнай ролі мусіць здымацца беларускі акцёр Руслан Чарнецкі. Але стваральнікі фільма абяцаюць у Мінску вялікую колькасць галівудскіх каскадзёраў і наогул нябачаныя дагэтуль у беларускім кіно трукі. Галоўныя сцэны рэжысёр фільма «Авель» Уільям Дэ Віталь плануе здымаць на Кастрычніцкай плошчы, куды будзе прыцягнута каля 4 тысяч чалавек масоўкі.

Кадр з мультфільма Аляксандра Ленкіна пра рыбку па імені Нельга.

«Беларусьфільм» тым часам працягвае абяцаць праект з Эмірам Кустурыцам. І нібыта сюжэтная канва ўжо ўзгоднена. Гаворка пойдзе пра інтэрнацыянальны партызанскі атрад, які прайшоў усю Беларусь і палову Еўропы падчас Другой сусветнай вайны.

Завершана праца над 12-серыйным тэлесерыялам «Ой, мамачкі!» (рэж. Іван Паўлаў), пра які «Звязда» пісала раней. І цяпер серыял плануюць прадаць на расійскае тэлебачанне.

У лютым абяцаюць нарэшце завяршыць фільм «Белыя Росы. Вяртанне» (рэж. Аляксандра Бутар). І, магчыма, нават паспрабуюць прапанаваць яго для адбору на конкурс маладых рэжысёраў Канскага кінафестывалю.

Дарэчы, на Канскі кінафестываль у «Беларусьфільма» сёлета таксама вялікія спадзяванні. Будзе пашыраны павільён беларускага дакументальнага і анімацыйнага кіно. Толькі вось усё адно без па-еўрапейску высакаякаснай працы ў павільёне наўрад ці беларускае кіно прыцягне шмат увагі на канскім кінарынку. Хіба што фармальна беларускае кіно папрысутнічае на самай буйной і прэстыжнай кінападзеі свету.

Студыя анімацыйных фільмаў «Беларусьфільма» сёлета плануе выпусціць 7 мультфільмаў (летась выпусціла пяць). Ірына Кадзюкова працуе над фільмам «Шапэн» з нізкі «Казкі старога піяніна». Абяцаюць скончыць працу і над шостай часткай анімацыйнага фільма «Аповесць мінулых гадоў». Выйдуць мультфільмы Аляксандра Ленкіна «Рыбка па імені Нельга 5», «Песня жаўрука» Таццяны Кубліцкай, «Ронда Капрычыёза» Ігара Воўчака, «Пра вала» Яўгена Надточая, «Дзюдзя» («Хрюша») Уладзіміра Пяткевіча.

Падрабязней пра сітуацыю з дакументальным кіно на студыі «Летапіс» чытайце неўзабаве на старонках нашай газеты.

**Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ**

■

Генадзь Міцкевіч:

БЕЛЭКСІМГАРАНТ
EXIMGARANT OF BELARUS

# «ЦІКАВАСЦЬ ДА ІНСТРУМЕНТАЎ І МЕХАНІЗМАЎ СТРАХАВАННЯ СЯРОД АЙЧЫННЫХ ЭКСПАРЦЁРАЎ УЗРАСТАЕ»

**Магістральнай задачай беларускай эканомікі ў новым гаспадарчым годзе з'яўляецца максімальнае нарошчванне экспарту, пошук і асваенне новых рынкаў. Яе паспяховаму выкананню спрыяе дзейнасць Беларускага рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства экспартна-імпартнага страхавання «Белэксімгарант». Згодна з рэйтынгам страхавых кампаній, прадпрыемства з'яўляецца адным з несумненных лідараў айчыннага страхавога рынку, трывала ўваходзіць у тройку найбольш моцных.**

**Карэспандэнт «Звязды» сустрэўся з генеральным дырэктарам «Белэксімгаранта» Генадзем Міцкевічам.**

**З Генадзем Антонавічам чытачы «Звязды» знаёмыя. Коратка нагадаем, што свой працоўны шлях выпускнік фінансава-эканамічнага факультэта знакамітага наргаса пачынаў у Дубровенскім раёне. Пасля некалькіх гадоў работы ў сістэме Міністэрства фінансаў РБ прызначаны дырэктарам дэпартамента страхавання Белдзяржстраха.**

**Калі было прынята рашэнне ўрада аб стварэнні «Белдзяржзнешстраха» (цяпер «Белэксімгарант»), прыйшоў сюды першым намеснікам генеральнага дырэктара. Са снежня 2009 года ўзначальвае калектыў.**

Генеральны дырэктар «Белэксімгаранта» Генадзь МІЦКЕВІЧ.

**— Паважаны Генадзь Антонавіч, рэальны сектар эканомікі падводзіць вынікі работы за мінулы год. Тыя калектывы, без дапамогі якіх дзейнасць рэальнага сектара не была б эфектыўнай, таксама. Што прадэманстраваў год мінулы?**

— Вынікі пакуль папярэднія. Эканамічную сітуацыю, якая склалася ў рэспубліцы летась, усе памятаюць. Прадпрыемствы, і перш за ўсё валаўтваральныя, займаліся разгрузкай складоў, паступленнем валютнай выручкі, забеспячэннем станоўчага сальда ў знешнім гандлі. Мы таксама працавалі ў рамках гэтых агульных задач па сваім напрамку і ў межах сваёй кампетэнцыі, якой нас надзялілa дзяржава (я маю на ўвазе перш за ўсё вядомы Указ № 534 Прэзідэнта «Аб садзейнічанні развіццю экспарту тавараў, работ і паслуг»).

Агульнае напружанне ўсе нашы структурныя падраздзяленні адчулі вельмі выразна дзякуючы ўзрослым у 2013 годзе аб'ёмам работы па падтрымцы айчынных экспарцёраў. Гэта абумовіў рост цікавасці да інструментаў і механізмаў страхавання як з боку органаў дзяржаўнага кіравання, галіновых міністэрстваў, канцэрнаў, так і саміх прадпрыемстваў-экспарцёраў, асабліва буйных. У выніку аб'ём экспартнага страхавання, аб'ём страхавога пакрыцця экспартных кантрактаў, беларускіх крэдытаў за мінулы год павялічыўся ў параўнанні з 2012 годам у 1,7 раза і ўпершыню дасягнуў рэкордная планкі ў 895,7 мільёна долараў ЗША.

Узрошы аб'ём ахопленасці экспарту страхаваннем, па нашых папярэдніх ацэнках, павінен дасягнуць 2,4 працэнта супраць 1,1 працэнта за 2012 год. Многа гэта ці мала? Гэтая лічба параўнальная з сярэднееўрапейскімі паказчыкамі вядомых страхавых кампаній, з якімі мы супрацоўнічаем.

Павялічылася колькасць прадпрыемстваў, у асноўным буйных, якія пажадалі застрахаваць знешнеэканамічныя рызыкі. Калі раней іх колькасць не перавышала сотню, то цяпер мы перайшлі гэты «рубікон» і атрымалі ў параўнанні з 2012 годам рост на 139 працэнтаў. Радуе, што расце доля прадпрыемстваў малога і сярэдняга бізнесу.

**Павялічылася колькасць прадпрыемстваў, у асноўным буйных, якія пажадалі застрахаваць знешнеэканамічныя рызыкі. Калі раней іх колькасць не перавышала сотню, то цяпер мы перайшлі гэты «рубікон».**

Яшчэ адна асаблівасць 2013 года — рост попыту на экспартныя крэдыты з боку нашых прадпрыемстваў, у асноўным у валюце. Попыт быў даволі высокім, нягледзячы на тое, што ўзмацніўся кантроль за грашова-крэдытнай палітыкай з боку дзяржавы.

Дарэчы сказаць, дзяржава ўсяляк падтрымлівае і стымулюе такую форму дапамогі прадпрыемствам. І па мінулым годзе сумы экспартных крэдытаў выраслі больш чым у два разы. У гэтай схеме былі задзейнічаны прадпрыемствы практычна ўсіх міністэрстваў і канцэрнаў.

Зразумела, што страхаванне экспартных крэдытаў і кантрактаў павялічвае для прадпрыемства дэбіторскую запазычанасць, паколькі мы страхуем адтэрміноўку плацяжу, рызыку неаплаты з боку пакупніка. Але ў тых умовах, калі вытворцы нацэлены на максімальнае атрыманне валютнай выручкі, на пошук новых рынкаў, новых кліентаў, на гэта адназначна варта ісці. Асабліва калектывам, якія ствараюць тавары з высокай дабаўленай вартасцю, так званыя інавацыйныя тавары.

Вось, калі коратка, папярэднія вынікі работы «Белэксімгаранта» па рэалізацыі Указа № 534 у мінулым годзе. Некаторыя праблемы ўсё ж засталіся і перайшлі на гэты год. Перш за ўсё мы будзем больш актыўна і, спадзяюся, больш эфектыўна працаваць з айчыннымі прадпрыемствамі-экспарцёрамі, якія пакуль не выкарыстоўваюць механізмы страхавання знешнеэканамічных рызык.

З гэтай мэтай умацавалі свае структурныя падраздзяленні як у цэнтральным апараце, так і ў філіялах, што займаюцца экспартным страхаваннем. Створаны новыя структурныя падраздзяленні, якія ажыццяўляюць экспартнае страхаванне ў рэгіёнах краіны, у абласцях. І гэты напрамак плануем умацоўваць.

Летась філіялы выйшлі на новы, больш якасны ўзровень працы, што прыемна адзначыць. Беларуская асацыяцыя страхаўшчыкоў, аналізуючы работу філіялаў усіх беларускіх страхавых кампаній, склала іх рэйтынг у рэгіёнах. Улічваліся, безумоўна, і аб'ёмы страхавых аперацый. Цікава, што нашы філіялы, а яны параўнальна маладыя, практычна ўсе ўвайшлі ў першую пяцёрку. Гэта — істотны паказчык і яшчэ адзін станоўчы нюанс 2013 года.

Умацаванне ўсяго прадпрыемства, разам з філіяльнай сеткай, адбылося і ў сэнсе кадравага забеспячэння, і ў сэнсе павышэння кваліфікацыі нашых работнікаў. Нам ніхто ў масавым парадку не рыхтуе кадры, рыхтуем іх самі, на практыцы. Хіба што дапамагае родны «наргас», дзе ёсць група будучых работнікаў страхавых арганізацый.

Важна і тое, што склалася сістэмная праца з органамі дзяржаўнага кіравання, з мясцовымі органамі ўлады на месцах па папулярызацыі механізмаў, прадугледжаных Указам № 534. У якасці прыкладу скажам, што разам з аблвыканкамамі праводзім навучальныя семінары спецыялістаў прадпрыемстваў-экспарцёраў. Падключаем да гэтай работы міністэрствы і канцэрны. Апошні такі семінар правялі ў мінулым снежні з Міністэрствам прамысловасці для спецыялістаў больш чым сотні суб'ектаў гаспадарання.

**— Удакладніце, калі ласка, ці вырас летась уласны капітал «Белэксімгаранта»? Для страхавога прадпрыемства гэта важная пазіцыя. Два гады назад ён перавышаў 463 мільярды беларускіх рублёў.**

— Мы істотна нарасцілі ўласны капітал. Яшчэ ў снежні 2012 года статутны капітал быў павялічаны на 3,4 трыльёна рублёў, што было прадугледжана бюджэтам Рэспублікі Беларусь пры ўдакладненні параметраў 2012 года. Зараз за кошт уласных сродкаў, з прыбытку, таксама папоўнілі статутны капітал больш чым на 44,5 мільярда рублёў. Такім чынам, уласны капітал сёння перавышае 4,1 трыльёна беларускіх рублёў.

Можна засведчыць, што ўласны капітал «Белэксімгаранта» па сваіх памерах супастаўны з капіталам буйных экспартна-крэдытных агенцтваў. Не выпадкова захаваны рэйтынг фінансавай устойлівасці. Мы пацвярджаем яго штогод праз міжнароднае рэйтынгавае агенцтва, якое выдала нам прагноз — «Стабільны».

**— Чым можна патлумачыць рост аб'ёмаў страхавых рэзерваў?**

— Тым, што істотна ўзраслі аб'ёмы самога страхавання і патрэбна фінансавае забеспячэнне прынятых абавязацельстваў. Хоць у бюджэце і прадугледжаны сродкі на выплату страхавога пакрыцця па дагаворах страхавання экспартных крэдытаў «Белэксімгаранта» — пры з'яўленні такой неабходнасці: летась было закладзена 870 мільярдаў рублёў бюджэтнай пазыкі.

Да гэтай крыніцы ў бюджэце мы ні разу не звярталіся і раней, і ў 2013 годзе таксама. А на 2014 год гэтая сума закладзена ў памеры 2,1 трыльёна рублёў.

Калі далей гаварыць пра бюджэт, то летась Мінфін уносіў у яго змены ў частцы павелічэння гранічнага памеру абавязацельстваў па дагаворах страхавання экспартных рызык з падтрымкай дзяржавы, паколькі вельмі рэзка ўзраслі аб'ёмы страхавання, пра што я ўжо казаў. На 2014 год гранічны памер абавязацельстваў у бюджэце павялічаны да 1 мільярда 105 мільёнаў долараў ЗША. Рост на 130 працэнтаў у параўнанні з мінулым годам.

**— Такім чынам можна сказаць, што дзяржаўная праграма развіцця страхавой дзейнасці вашым калектывам выконваецца?**

— За 2013 год мы выканалі ўсе паказчыкі, якія былі вызначаны для «Белэксімгаранта» рэспубліканскай праграмай развіцця страхавой дзейнасці, і выканалі іх якасна. Нават пераглядвалі ўласныя бізнес-планы ў бок павелічэння, і таксама справіліся.

Працавалі рэнтабельна, з прыбыткам — на што і нацэлвае кіраўніцтва краіны, калі пастаянна падкрэслівае, што галоўныя паказчыкі эфектыўнасці работы — гэта рэнтабельнасць, прыбытковасць, апераджальныя тэмпы росту прадукцыйнасці працы над тэмпамі росту заработнай платы.

**— Дазвольце пытанне, адказ на якое, безумоўна, зацікавіць чытачоў: ці з'явіліся за апошні час новыя віды паслуг?**

— Новыя віды страхавання з'яўляюцца кожны год. Цяпер у нас звыш 50 відаў страхавання, запатрабаваных суб'ектамі гаспадарання. У апошнія гады былі застрахаваны буйныя праекты. У ліку знакавых можна назваць такі праект: летась разам з Белдзяржстрахам застрахавалі будаўніцтва Беларускай атамнай электрастанцыі. Аб'ёмы работ на будоўлі вельмі вялікія, таму страхаванне ажыццявілі дзве самыя буйныя айчынныя страхавыя кампаніі, у якіх самы вялікі ўласны капітал. І сёння мы суправаджаем гэты аб'ект.

Што датычыць экспартнага страхавання, то ў нас сёння прадугледжана 9 кірункаў. Яшчэ нядаўна было 8, дабавіўся факторынг. Імкнёмся, каб па ўсіх гэтых стратэгічных кірунках працаваў не толькі цэнтральны офіс, але і ўсе нашы філіялы на месцах. А ў нас досыць разгалінавана філіяльная сетка — працуе 7 прадстаўніцтваў у абласцях, а таксама прысутнічаюць прадстаўніцтвы ў буйных гарадах і рэгіёнах.

Аб усім новым у сваёй рабоце расказваем на ўласным сайце, які цалкам перапрацавалі і ўдасканалілі, зараз ён больш інфарматыўны. Вядзецца на рускай і англійскай мовах, што робіць яго цалкам даступным не толькі нашым кліентам, але і іх замежным контрагентам. Падрабязна расказваецца пра ўсе нашы магчымасці, асабліва пра тыя, што датычаць экспартнага страхавання, а таксама працэдуры падрыхтоўкі і заключэння страхавых кантрактаў, увесь рэгламент. Што датычыць доступу да нашых паслуг, то заяўку можна падаць у электроннай форме.

Шмат робім для папулярызацыі паслуг «Белэксімгаранта» праз сродкі масавай інфармацыі.

**— Напрыканцы мінулага года прайшла нарада ў Прэзідэнта, дзе размова ішла ў тым ліку аб пашырэнні механізму фінансавай падтрымкі экспарту. Якія рычагі будуць задзейнічаны перш за ўсё?**

— Прыняты бюджэт Рэспублікі Беларусь на 2014 год, у якім прадугледжаны канкрэтныя сродкі на падтрымку экспарту. У прыватнасці, калі ў цэлым для падтрымкі экспарцёраў выдзяляецца больш за 2 трыльёны рублёў, то ў рамках Указа № 534 прадугледжана сума ў 562 мільярды рублёў на кампенсацыю страт банкаў ад прадастаўлення экспартных крэдытаў. У параўнанні з папярэднім годам рост на 157 працэнтаў, а прадпрыемствам-экспарцёрам гэта — рэальная дапамога. Бо існуе вялікая розніца: браць крэдыт у банку па камерцыйна арыентаваных стаўках (а гэта ад 10 да 15 працэнтаў гадавых) ці па стаўцы 1,5-1,7 працэнта, калі з такой вось дзяржаўнай падтрымкай. А розніца кампенсуецца з бюджэту.

**Новыя віды страхавання з'яўляюцца кожны год. Цяпер у «Белэксімгаранта» звыш 50 відаў страхавання, запатрабаваных суб'ектамі гаспадарання.**

Існуюць і іншыя механізмы фінансавай падтрымкі экспарцёраў. У прыватнасці, згодна з Указам № 466 «Сбербанк России» атрымлівае кампенсацыю па крэдытах, якія ён выдае расійскім пакупнікам беларускай тэхнікі. Зараз гэты механізм пашыраецца таксама на Казахстан і Украіну.

**— Раскажыце, калі ласка, больш падрабязна аб вашай рабоце не толькі з дзяржаўным сектарам эканомікі, але і з прыватнымі прадпрыемствамі.**

— Сёння беларускі ўрад клапоціцца, каб асноўная маса ўнутранага валавога прадукту прырастала не толькі за кошт буйных, валаўтваральных дзяржаўных прадпрыемстваў-гігантаў, але і з дапамогай сярэдняга і малога бізнесу, як ва ўсім свеце. Таму гэта і для нас сур'ёзны кірунак работы.

Мы супрацоўнічаем з «прыватнікамі» і напрамую, і праз мясцовыя органы ўлады, і праз Беларускую гандлёва-прамысловую палату, у якой шмат кліентаў у прыватным сектары эканомікі. Доля дагавораў з такімі партнёрамі ў нас расце, дынаміка тут адназначна станоўчая, бо прыватны бізнес даражыць сваім капіталам. І ён не будзе пастаўляць прадукцыю за мяжу, калі не ўпэўнены, што гарантавана адбудзецца аплата. Такую ўпэўненасць даём яму мы.

Тым больш што дзеянне Указа Прэзідэнта № 534 без нейкіх там абмежаванняў распаўсюджваецца на суб'екты гаспадарання ўсіх формаў уласнасці — рэзідэнтаў Рэспублікі Беларусь.

Да слова сказаць, штогод праводзіцца конкурс «Лепшы экспарцёр года» пад эгідай Беларускай гандлёва-прамысловай палаты і Міністэрства замежных спраў. Сярод фіналістаў і прызёраў гэтага конкурсу больш за палову (60 працэнтаў) складаюць прадпрыемствы, якія ў сваёй дзейнасці выкарыстоўваюць механізм Указа № 534. Яны істотна павялічылі экспарт тавараў, у тым ліку з прымяненнем страхавой абароны, гэта нашы кліенты — «Контэ Спа», «Беліта-Вітэкс», «Дэліс Касметык» і многія іншыя.

У знешнегандлёвым абароце ў іх шмат кантрактаў з адтэрміноўкай плацяжу, і без нашай страхоўкі яны гэтыя кантракты імкнуцца не заключаць. Тым больш што цану страхавога паліса можна ўключыць у сабекошт і спакойна працаваць далей. Страхавое забеспячэнне іх экспарту «Белэксімгарантам» даходзіць да 60-70 працэнтаў. А калі ўлічыць, што колькасць прадпрыемстваў прыватнага сектара пашыраецца, то тут мы бачым перспектыву.

**— Ці многія айчынныя прадпрыемствы-экспарцёры працуюць на ўмовах міжнароднага лізінгу?**

— Есць два нацыянальныя лізінгавыя аператары, якім даручана прасоўванне айчыннай тэхнікі за межамі краіны на ўмовах фінансавага лізінгу. Гэта «Прамагралізінг», адным з акцыянераў якога мы з'яўляемся, і «АСБ Лізінг». Іх доля ў нашым страхавым партфелі пакуль невялікая, але справа перспектыўная і вартая ўвагі. Мы, безумоўна, зацікаўлены, каб яны больш шырока страхавалі свае міжнародныя лізінгавыя здзелкі.

**— На рынках сітуацыя не простая. Скажыце, ці расце колькасць страхавых выпадкаў?**

— Такіх выпадкаў хапала ў пачатку нашай дзейнасці, асабліва падчас і пасля сусветнага фінансавага крызісу 2008 года. Тады пайшлі масавыя неплацяжы па кантрактах, па здзелках.

Апошнія гады мы, выходзячы з уласнага вопыту, з практыкі андэрайтынгавай работы па вывучэнні кліентаў і іх контрагентаў, выбудоўваем такія схемы, па якіх можам мінімізаваць верагоднасць наступлення так званых страхавых выпадкаў. Кожны год іх колькасць зніжаем.

Па мінулым годзе ў нас было ўсяго 16 кампенсацыйных выплат прыкладна на 310 тысяч долараў ЗША. Хаця іх магло быць і значна больш.

Наша пазіцыя такая: калі тэрмін выплаты па кантракце прыйшоў, а яна не паступіла, то «Белэксімгарант» разам з прадпрыемствам-экспарцёрам неадкладна прымае меры, каб забяспечыць безумоўнае паступленне валютнай выручкі.

Гэтыя прэвентыўныя крокі ў пераважнай большасці выпадкаў даюць свой эфект. Так што лічбу 16 можна разглядаць як паказчык даволі якаснай работы.



Пагадненне аб супрацоўніцтве падпісваюць старшыня праўлення «Укрэксімбанка» Віталь БЕЛАВУС (злева) і генеральны дырэктар «Белэксімгаранта» Генадзь МІЦКЕВІЧ.

**Важна і тое, што склалася сістэмная праца з органамі дзяржаўнага кіравання, з мясцовымі органамі ўлады на месцах па папулярызацыі механізмаў, прадугледжаных Указам № 534.**

**— А калі ўсё ж адбываецца затрымка з выплатай?**

— Тады беларускае прадпрыемства-экспарцёр атрымлівае сродкі за свой тавар ад нас, а мы працягваем працаваць з яго контрагентам па працэдуры субрагацыі — вяртання сродкаў.

**— І колькі за апошні час па субрагацыі вы вярнулі грошай у Беларусь?**

— Прыкладна 400 тысяч долараў.

**— Нешта яшчэ засталося «вісець»?**

— Ёсць запазычанасці, і перш за ўсё па так званых «праблемных» рэгіёнах. Мы працуем больш чым з 40 краінамі, і не ва ўсіх палітычная сітуацыя спрыяе вядзенню бізнесу, а дзе-нідзе наогул замінае.

Павялічылася доля краін з высокім узроўнем палітычнай рызыкі. Зараз яна даходзіць да 27 працэнтаў (у параўнанні з 2012 годам узрасла на 4-5 працэнтных пунктаў), таму і заклікаем сваіх кліентаў быць разборлівымі, скажам так, у эканамічных сувязях. Каб тая ж разгрузка складоў не ператварылася ў фікцыю, калі тавар проста перамясцілі з аднаго склада на іншы, за мяжой, — а грошы за яго паспрабуй атрымай!

Тым не менш стаіць звышзадача дывэрсіфікацыі экспарту, асваення новых рынкаў. У тым ліку ў Цэнтральнай і Паўднёвай Амерыцы, у рэгіёнах Афрыкі і Паўднёва-Усходняй Азіі і іншых, не менш перспектыўных.

Гэта працэс працяглы па часе, адразу ад новых рынкаў няма высокай аддачы. Пакуль наша тэхніка там асвоіцца, пройдзе належныя працэдуры... Ды і адпаведны сэрвіс для пакупнікоў варта наладзіць.

Але стратэгічную задачу патрэбна выконваць, і мы працуем з нашымі прадпрыемствамі ў гэтым кірунку, дапамагаючы мінімізаваць рызыку ад знешнегандлёвай дзейнасці альбо нават звесці яе да нуля.

«Ралі Дакар-2013».

**Публікацыю падрыхтаваў Уладзімір ХІЛЬКЕВІЧ.**
**Здымкі прадастаўлены прэс-службай «Белэксімгаранта».**

*УНП 101421509*
*Спецыяльны дазвол (ліцэнзія) № 2200/13-00049 на права ажыццяўлення страхавой дзейнасці. Выдадзены Міністэрствам фінансаў РБ. Сапраўдны па 23 красавіка 2018 года.*

***Ад рэдакцыі.** Выказваем шчырую падзяку начальніку службы па сувязях з грамадскасцю і рэкламе Дар'і ІБРАГІМАВАЙ за дапамогу ў падрыхтоўцы публікацыі.*

■ Простая мова

# ШТО ЁСЦЬ ЖЫЦЦЁ? ТЭАТР?

**Навагоддзе, не вам казаць, пахне хвояй, мандарынамі, салатай аліўе, якая, дарэчы, яшчэ адну назву мае. У нас, з мамінай «падачы», яе завуць семярнёй — па колькасці складнікаў-інгрэдыентаў. Што вельмі зручна: каўбаса — раз, бульба — два... Гарошак, агурок, яйкі, цыбуля, маянэз — і гатова. А ўжо смачна!..**
**— Мая Іванаўна, адпусціце мяне са школы раней, — папрасілася дзіця ў знаёмай настаўніцы.**
**— А што здарылася? — спытала тая.**
**— Ды ў маёй мамы сёння юбілей — да нас госці прыйдуць...**
**— Ну дык хай яны без цябе трохі пасядзяць. Бо ў нас важны ўрок: не бяда, калі і спознішся.**
**— Гэта вам не бяда, — захлюпала носам дзяўчынка. — А мне — дык яшчэ і якая... Бо я сваіх ведаю: яны дакладна ўвесь гарошак з'ядуць.**
**...Салата з водарам свята.**

## За таго хлопца!

Правіла жыцця — з дому трэба выходзіць з запасам цяпла. І цеплыні... А ў маразы — дык і ў цёплых апратках: футрах, шапках, даўжэзных вязаных шаліках, якія можна (і модна цяпер) намотваць на шыю, вушы, вочы і нават вышэй...

Баба Лена, праўда, не з такіх: на дварэ мінус 20, а яна ў лёгкім паліцечку, у тонкай хустцы, завязанай пад бараду, без пальчатак-рукавіц... Кур'ерам на паўстаўкі працуе, вось і носіцца дзень пры дні з адной установы ў другую... Чым магла б прымільгацца... Але ж не: надоечы, як нам распавяла, яе мужчына нейкі спыніў — на ўваходзе ў будынак. Сказаў:

— Прабачце, можна, я паліто вам куплю?

— Не, чалавеча, — спужалася бабуля, — не трэба! Мне зусім не холадна!

Ды ходу ад яго.

Уцякла. А цяпер шкадуе. Бо — па-першае — дабрадзея таго зусім не разгледзела («Паліто — яно ж вялікіх грошай каштуе! А ён — бач — хацеў аддаць! Чужой чужаніцы!»)... Бо — гэта па-другое — не сцяміла, адкуль (канкрэтна) ён мог узяцца (у пінжаку — значыць, з нейкай машыны? Ці з суседняга дома?). Бо не спытала, чый ён, адкуль і якіх бацькоў? Як самога завуць урэшце? А ведаць жа гэта трэба.

— Пайду я ў царкву, — разважае цяпер жанчына, — пастаўлю там свечку... А запіску мне як падаць: «За таго хлопца, што хацеў мне купіць паліто?» Дык жа, мусіць, не дойдзе?»

— Павінна, — суцяшаем мы.

Ну хаця б таму, што розных там Паўлаў ды Іванаў на свеце безліч, а вось падобных «хлапцоў» — днём з агнём...

Ці ўсё ж такі знойдзеш?

## Мужык спытаў...

З ліста (у пераказе). Летам я збіралася паднавіць, асвяжыць сваю кухню, купіла сем трубак шпалер. На прыпынку паклала іх на лаўку (бо цяжка трымаць), а сама стаю — чакаю аўтобус... Пакуль ён, — падыходзіць нейкі мужык, барадаты, хітры, да ўсяго прыглядаецца, заводзіць размову. Маўляў, і сама я маладая ды прыгожая, і шпалеры выбрала добрыя, і кухня, мусіць, прасторная, бо трубак шмат, і кватэра... «Усё так, — кажу (бо ён жа пытаецца), — вялікая кухня... Толькі не ў кватэры яна, а ў хаце-пяцісценцы, у вёсцы... «А-а-а», — расчаравана зацягнуў барадач і змоўк: некуды знікла яго цікавасць, а потым і сам.

## Ёсць логіка

У аўтобусе людзей як селядцоў. Але ж, дзякаваць Богу, едзем. І нават не маўчым. Маладзіца (побач) аднекуль з-пад пахі расказвае мужчыну (мужу, як трэба разумець), што ў абед матнулася ў ЦУМ, што знайшла там патрэбную спадніцу (далей — і ў падрабязнасцях — пра якасць, тканіну, фасон, цану...), што памерала і тая так хораша «села»... Але ж яна не купіла яе, бо падумала, што...

Муж перапыніў:

—...Што не будзе куды павесіць?

— Не, што грошай няма.

...Мы, жанчыны, паводле анекдотаў, можам доўга разглядваць тры рэчы, а купіць у выніку... дзевяць.

Альбо не купіць — ніводнай.

## Адным радком

Старая песня на новы лад: «Плачет девочка в банкомате...»

## Навука

У знаёмай швачкі двое дзяцей. Хутка растуць: дачушка амаль дарослая ўжо (гадоў з пяць не бачыла). Трэба ж спытаць (мы ў метро разам едзем), як жыве, чым займаецца? Можа, як маці, — дызайнам адзення, шытвом?

— Не, Божа барані, — адхрышчваецца тая. — Гэта не маё: я нават іголку ў руках трымаць не ўмею.

— Навуку знайшла... Гэта ж не скальпель, — спрабуем пажартаваць мы. — Гузік, пэўна ж, прышыеш?

— Не. У сям'і гэта заўсёды маміна было, а цяпер у мяне хлопец з'явіўся. Ён у войску служыў — умее... А я дык і вучыцца не буду.

...Дыялог гэты ўспомніўся міжволі ў маленькім сталічным атэлье, куды адна з кліентак штонікі ад піжамы прынесла — у рамонт: гумка парвалася...

## Да лямпачкі

Запальнічку для газавай пліты купляеш рэдка: паспрабуй разбярыся, чым тая, што за 28 тысяч рублёў, адрозніваецца ад той, што за 83? Тут хоць-нехаць папросіш парады — звернешся да прадаўца.

Хлопец (яны ўсё часцей цяпер за прылаўкамі) з ахвотай тлумачыць... І, як аказалася, не мне адной: поплеч нейкі дзядок прыстаў — вушы навастрыў, таксама разглядае тавар, таксама слухае. Ды што там — нават не маўчыць: хваліцца, злавіўшы паўзу, што таксама добра ведае беларускую мову, што яна, маўляў, і прыгожая, і багатая... А таму — ну вельмі шкада, што на ёй у Мінску ніхто не гаворыць...

Трэба было сказаць чалавеку, што ён моцна памыляецца наконт «ніхто», што людзі такія і ёсць, і будуць... Але ж часу тады — ні хвіліны: хіба на тое, каб заплаціць за цуда-запальнічку, каб спехам падзякаваць прадаўцу. І ўжо сыходзячы, пачуць за спінай дзедава:

*— А мне, пожалуйста, четыре лампочки...*

## Пры ўсім багацці выбару...

Кніга — лепшы падарунак. Асабліва — калі туды, у якасці закладкі, пакласці сто баксаў. А лепей, зразумела, тысячу. І, вядома ж, не галяком, як той казаў, а ў адмысловым канверціку.

Іх цяпер шмат прадаецца, на ўсе выпадкі жыцця: «С днем рождения!», «С юбилеем!», «С днём свадьбы!», з кароткім «Поздравляем!»...

— А з беларускім тэкстам нічога няма? — пытаем у прадавачкі.

— Не, — круціць галавою жанчына. Але зазірае ўсё ж пад «прылавак» і... знаходзіць: з *нашымі* словамі і нацыянальным арнаментам, з сінімі валошкамі...

— Што ж вы такую прыгажосць хаваеце? — разглядаючы, выбіраючы, наракаем мы.

— Дык з рускімі словамі людзі лепей бяруць, — апраўдваецца гандлярка.

...Можа, таму, што іншых на тым прылаўку не бачаць?

## Без адказу

Горад. Дзень. Лякарня... Слова — як выйсце, бо гэта некалі тут была звычайная паліклініка, цяпер — бяры вышэй, як той казаў — ААТ (адкрытае акцыянернае таварыства) з аказаннем шырокага спектра паслуг на платнай аснове, як сваім грамадзянам, так і замежным. Бо, відаць, спецыяльна для іх на ўваходзе месціцца стэнд са спісам дактароў — з указаннем пасад, катэгорый, гадзін прыёму... І ў ім, асобным слупочкам, прозвішчы тых, хто з пацыентамі можа размаўляць па-англійску.

А зрэшты, нічога ў тым незвычайнага: усё лагічна — для сталіцы еўрапейскай дзяржавы ў Год гасціннасці...

Але ж на думкі наводзіць. Ну напрыклад: спіс дактароў, якія даюць беларускую мову, могуць і хочуць размаўляць на ёй, быў бы ў гэтай клініцы даўжэйшым ці карацейшым? А давер да іх з боку пацыентаў — большым ці меншым?

Ёсць пытанні, як той казаў...

## Розніца

Абед, кавярня — у хлопца за суседнім столікам звініць мабільнік: хтось пытае, відаць, дзе ён. Адказ нечаканы:

— Ды паесці прыйшоў... Як заўжды, на Якубіка...

Гэта, трэба разумець, пра вуліцу Коласа? І напэўна ж, з любоўю, бо на наступнае з заўсёдных пытанняў (пра справы) хлопец адказвае менавіта ягоным: «Паскудства, брат, і не пытайся...». Затым — тлумачыць прычыну: маўляў, рэвізія на працы чакаецца, з падатковай.

Яму, у тым чаканні (ну няцяжка ж здагадацца?) раяць падаткі заплаціць і спаць спакойна. Ён тут жа пярэчыць: «Ага, заснеш... Год таму ўсё да капейкі сплаціў: праверылі — не знайшлі да чаго прыдрацца. Але ж на фірме тыдзень прасядзелі, працу сваю апраўдаць павінны... Адкрытым тэкстам мне: так і так, маўляў, трэба «адкупіцца», трэба падпісаць, што заплаціў не ўсё. І нідзе ж не дзеўся — падпісаў...

У тым, Якубавым стагоддзі, як сведчыць гісторыя, «прызнанні» найчасцей выцягвалі. У гэтым — просяць па-добраму?

## Тэатр

Дзяўчына марыла стаць артысткай, але ў тэатральным быў дужа вялікі конкурс. Паступіла туды, дзе меншы, вучылася (з горам папалам), а паралельна іграла , можа, лепшую ў свеце ролю: ролю закаханай... То ў аднаго, то ў другога, то...

Гэты, чарговы яе абраннік, быў нашмат старэйшы, жанаты... Што «артыстку» спыніць не магло — яна сама, што называецца, абрывала яго тэлефон, сама запрашала ў госці. Ён прыязджаў (а хто б адмовіўся?!)... Праўда, зрэдчас, ненадоўга і вельмі абачліва, бо любіў сваё ранейшае жыццё і нічога ў ім мяняць не збіраўся. Пакуль...

Пакуль яму не пазванілі з бальніцы, не сказалі, што... аперацыя прайшла нармальна, што пацыентка — ужо ў рэанімацыі.

Агаломшаны гэтай навіной, ён забыўся на ўсё — паляцеў, паехаў. Прарваўся праз шматлікія «нельга», але ж пабачыў (ён — яе, прыгожую, зусім бездапаможную, а ўся бальніца, адпаведна, — яго...), пачуў ад доктара, што жыць каханка, вядома ж, будзе — арганізм малады. А вось мець дзяцей — наўрад ці... Бо гэтая цяжарнасць была ўжо другой... пазаматачнай.

Ён ва ўсім вінаваціў сябе... Ён яе шкадаваў, разумеў... І не мог пакінуць!

Кінуў сям'ю, ажаніўся, ссівеў, сумуючы па дзецях, памяняў работу (бо на ранейшай, любімай не было перспектыў на жыллё, а на новай ім далі службовае)...

Пераехаў, жыве — як на першы погляд, дык нават добра, бо ўсё ж «утрэслася» — жонка маладая, прыгожая... І кахае...

Ці толькі іграе ролю? Сваю... Ужо да канца?

## Пошук

Студзень. Снег — можна сказаць, нарэшце! Бо гэта яшчэ і шанц (для мужчын, паводле анекдота) зляпіць сабе бабу. На ўласны густ.

Не лепяць... Што толку са снежнай? Да таго ж — гэта ўжо было: Бог (згодна з новай версіяй) стварыў не аднаго Адама, а цэлых... дзесяць! Потым прынёс ім гліны, прынёс цукру і сказаў, каб з гэтай «сыравіны» кожны з іх зляпіў сабе жонку, а ён затым удыхне жыццё.

Згадзіліся мужчыны, а ўжо стараліся! Кожны ляпіў, якую хацеў — з дабаўленнем слодычы...

І Бог, прымаючы работу, іх творчасць, вядома ж, ацаніў. Адно — уголас зазначыў, што цукру было адзінаццаць кавалачкаў, а не дзесяць — значыць, нейкі з мужоў паклаў у свой «выраб» два?

Высвятляць, каторы з іх (і ў якую з жонак), часу тады не было, ды і патрэбы, як здавалася, таксама. Пытанне «павісла»... «Вісіць»... І па-ранейшаму даймае! А таму дзевяць мужоў з дзесяці перабіраюць жанчын — шукаюць тую, самую салодкую.

І толькі адзін з іх гэтага не робіць, бо дакладна ведае, што ўсе жонкі роўныя: той дадатковы, адзінаццаты драбочак цукру ён папросту... з'еў.

**Валянціна ДОЎНАР**

■

## Прыйшла своечасова

Работнік Калінкавіцкага тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Валянціна Майсюкова абыходзіла сваіх падапечных (іх у яе ў вёсцы Бабровічы 11 чалавек). Калі падышла да хаты інваліда першай групы Платона Піліпейкі, пачула гук апавяшчальніка. Жанчына не разгубілася, адразу ж выклікала выратавальнікаў, а сама кінулася ў чорны смурод выратоўваць 83-гадовага пенсіянера. Як расказалі ў прэс-службе Гомельскага абласнога ўпраўлення МНС, разам з суседам яны ўдваіх паднялі старога чалавека з ложка і вынеслі яго на вуліцу. Мужчына шпіталізаваны ў мясцовую бальніцу. Цяпер высвятляюцца прычыны і акалічнасці здарэння. Не выключаецца, што ўзгаранне адбылося з-за няспраўнасці пячнога ацяплення.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

**ПРИГЛАШЕНИЕ**
**к участию в запросе ценовых предложений из одного лота**

Вид процедуры закупки – запрос ценовых предложений
1. Сведения о заказчике (организаторе):
1.1. полное наименование *коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости».*
1.2. место нахождения: *220050, Республика Беларусь, г. Минск, ул. К. Маркса, 39-10.*
1.3. учетный номер плательщика заказчика (организатора): *190398583.*
1.4. фамилия, имя, отчество контактного лица: *Сахаров Дмитрий Михайлович.*
1.5. номер контактного телефона/факса: *+ 375 17 327 48 36.*
1.6. адрес электронной почты: *auction@mgcn.by.*
1.7. размер оплаты услуг организатора (если таковой участвует в процедуре закупки): *нет.*
1.8. иные сведения: *нет.*
2. Сведения о предмете закупки:
2.1. предмет закупки (наименование): *работы и услуги по созданию и внедрению электронной торговой площадки, включая программное обеспечение.*
2.2. код предмета закупки (подвид ОКРБ 007-2007) и наименование предмета закупки в соответствии с ним: *72.22.12, услуги по разработке программного обеспечения на заказ.*
2.3. объемы закупки (в натуральном (с указанием единицы измерения) или денежном выражении): *580 000 000 (пятьсот восемьдесят миллионов) бел. рублей.*
2.4. место поставки товаров (выполнения работ, оказания услуг): *220050, Республика Беларусь, г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 10.*
2.5. источник финансирования закупки: *собственные средства.*
2.6. ориентировочные сроки осуществления закупки: *16.01.2014 – 30.04.2014.*
2.7. иные сведения: *нет.*
3. Сведения о запросе ценовых предложений (документации о закупке):
3.1. запрос ценовых предложений (документация о закупке):
